**ВЫБАРЫ Ў ПАЛАТУ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СЁМАГА СКЛІКАННЯ**

**ГРАМАДСКАЯ КАМПАНІЯ «ПРАВААБАРОНЦЫ ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ»**

# Аналітычная справаздача па выніках назірання

18 лістапада 2019 г.

**Змест**

Высновы
Уводзіны
Умовы назірання
Прававая база
Выбарчыя камісіі
Вылучэнне і рэгістрацыя кандыдатаў
Перадвыбарчая агітацыя
Датэрміновае галасаванне
Галасаванне ў дзень выбараў і падлік галасоў
Скаргі і звароты
Рэкамендацыі

## ВЫСНОВЫ

Выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання былі прызначаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 жніўня 2019 г. № 294 і адбыліся 17 лістапада 2019 г.

У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і выбары Прэзідэнта павінны былі адбыцца ў 2020 годзе – выбары дэпутатаў не пазней верасня 2020 г., а выбары прэзідэнта не пазней жніўня 2020 г.

Яшчэ за два гады да прызначэння выбараў старшыня ЦВК Л. Ярмошына заяўляла ў СМІ, што не выключае перанос адной з выбарчых кампаній 2020 г. на больш ранні

тэрмін. Паводле Л. Ярмошынай, рашэнне аб пераносе адной з выбарчых кампаній на 2019 г. будзе прымацца кіраўніцтвам краіны.

У красавіку 2019 г. А. Лукашэнка ў сваім традыцыйным штогадовым Пасланні да беларускага народа і Нацыянальнага сходу заявіў, што выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі Беларусь адбудуцца ў 2019 годзе. Такім чынам правядзенне парламенцкіх выбараў было прызначана на год раней за заканчэнне паўнамоцтваў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў папярэдняга склікання.

Паколькі падстаў для датэрміновага спынення паўнамоцтваў Парламента, прадугледжаных арт. 94 Канстытуцыі, няма, а чатырохгадовы тэрмін яго паўнамоцтваў не мінуў, Указ прэзідэнта №294 парушае канстытуцыйную норму пра тэрмін паўнамоцтваў Парламента, і з'яўляецца ўмяшальніцтвам у дзейнасць органа заканадаўчай улады. Істотнае скарачэнне тэрміну паўнамоцтваў Палаты прадстаўнікоў паменшыла колькасць сесій заканадаўчага органа да сямі (ПП НС чацвёртага склікання правяла 11 сесій, пятага склікання – 10 сесій).

Выбары праходзілі на фоне складаных палітычных абставін у свеце і ў Еўропе, якія істотна змяніліся, у тым ліку ў сувязі з расійска-украінскім канфліктам. Тэндэнцыя да пацяплення адносін паміж Беларуссю і ЗША, краінамі Еўразвязу, якая азначылася яшчэ перад папярэднімі выбарамі ў Палату прадстаўнікоў, прывяла да пэўных пазітыўных зменаў ва ўнутранай палітыцы. Улады пашырылі супрацоўніцтва з ААН і іншымі міжнароднымі арганізацыямі ў галіне правоў чалавека.

Аднак становішча з правамі чалавека ў Беларусі застаецца стабільна дрэнным, і сістэмных пазітыўных зменаў у гэтай галіне не адбываецца. Прагрэсіўныя змены ў заканадаўстве, якія рэгулююць ажыццяўленне правоў і асноўных свабод, – дэкрыміналізацыя ўдзелу ў дзейнасці незарэгістраваных арганізацый, увядзенне элементаў заяўнага прынцыпу арганізацыі масавых мерапрыемстваў – суправаджаюцца ўвядзеннем адміністрацыйнай адказнасці за тыя ж дзеянні і ўсталяваннем высокіх ставак за абавязковую ахову міліцыяй грамадскага парадку на масавых мерапрыемствах.

Адзначаецца значнае скарачэнне колькасці палітычна матываваных адміністрацыйных арыштаў і выпадкаў крымінальных спраў. Аднак пры гэтым улады цалкам не адмовіліся ад практыкі рэпрэсій у дачыненні да грамадзян, якія рэалізоўвалі свае канстытуцыйныя правы на свабоду меркаванняў і іх выказвання, свабоду мірных сходаў і веравызнанняў, пераследу незалежных журналістаў. Таксама не былі прынятыя меры па аднаўленні ў поўным аб'ёме палітычных і выбарчых правоў былых палітвязняў.

Рэкамендацыі БДІПЧ АБСЕ, якія былі зробленыя ў выніку назірання за папярэднімі парламенцкімі выбарамі ў 2016 годзе, так і не былі імплементаваныя ў нацыянальнае выбарчае заканадаўства. Праца створанай у 2016 годзе міжведамаснай працоўнай групы па падрыхтоўцы прапаноў аб унясенні зменаў у выбарчае заканадаўства скончылася нічым.

Такім чынам, парламенцкія выбары адбываліся паводле нормаў выбарчага заканадаўства і прававых практык, якія неаднаразова былі раскрытыкаваныя як нацыянальнымі, так і міжнароднымі місіямі па назіранню за выбарамі. Асноўныя праблемныя моманты выбарчага працэсу, такія як фармаванне выбарчых камісій, датэрміновае галасаванне, падлік галасоў, засталіся бяззменнымі. Гэтая акалічнасць шмат у чым паўплывала на характар адбыўшыхся парламенцкіх выбараў.

**Выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання ў цэлым не адпавядалі шэрагу ключавых міжнародных стандартаў правядзення дэмакратычных і свабодных выбараў, а таксама выбарчаму заканадаўству Рэспублікі Беларусь. Найперш гэтыя высновы абумоўлены адсутнасцю роўнага доступу да дзяржаўных СМІ для ўсіх кандыдатаў, адсутнасцю бесстаронніх выбарчых камісій, фактамі выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу на карысць праўладных кандыдатаў, шматлікімі фактамі прымусу выбарцаў да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні, закрытасцю шэрагу выбарчых працэдур для назіральнікаў.**

**Традыцыйна найбольшыя аргументы для крытыкі даюць непразрыстыя працэдуры падліку галасоў, што дае падставы для сур’ёзных сумневаў адносна адпаведнасці вынікаў такога падліку рэальнаму волевыяўленню выбарцаў.**

## Выбарчыя камісіі

Большасць назіральнікаў кампаніі мелі магчымасць бесперашкодна прысутнічаць на пасяджэннях органаў, якія ўтваралі ТВК, АВК і УВК.

На пасяджэннях органаў па фарміраванні ТВК і АВК у большасці выпадкаў абмяркоўваліся дзелавыя і асабістыя якасці вылучаных у склад выбарчых камісій, праводзілася персанальнае галасаванне. Аднак пры фарміраванні УВК у большасці выпадкаў (77,5%) абмеркавання вылучаных у склад прэтэндэнтаў не адбывалася і галасаванне праходзіла па загадзя вызначаным спісе прэтэндэнтаў без абмеркавання кандыдатур (52,5% выпадкаў). У асноўным гэта датычылася УВК, у якіх не было конкурсу, і ўсе вылучаныя асобы былі ўключаныя ў камісіі. Пры гэтым, у шэрагу выпадкаў назіральнікі паведамлялі, што прэтэндэнты былі загадзя адабраныя спецыяльна створанымі выканкамамі “рабочымі групамі”.

У большасці выпадкаў назіральнікі адзначаюць “вытворчы прынцып” фарміравання УВК, калі сябры камісіі прадстаўляюць адзін і той жа працоўны калектыў, а іх непасрэдныя начальнікі з’яўляюцца старшынямі гэтых выбарчых камісій; склад УВК паводле назіральнікаў кампаніі не выявіў значных зменаў з моманту правядзення папярэдніх выбарчых кампаній.

Адсутнасць у выбарчым заканадаўстве гарантый уключэння ў склад выбарчых камісій прадстаўнікоў, вылучаных усімі палітычнымі суб’ектамі, якія прымаюць удзел у

выбарах, як і раней, робіць магчымым адвольны і дыскрымінацыйны падыход у дачыненні да апазіцыйных партый і рухаў.

Асноўнымі арганізатарамі выбараў, як і раней, з’яўляюцца прадстаўнікі пяці найбуйнейшых праўладных грамадскіх аб’яднанняў (Белая Русь, БРСМ, Беларускі саюз жанчын, Беларускае грамадскае аб’яднанне ветэранаў) і прафсаюзаў, што ўваходзяць у ФПБ, да якіх сёлета далучыўся Беларускі фонд міру. Уключэнне прадстаўнікоў гэтых арганізацый ў ТВК, АВК і УВК склала 92,8%, 93,6% і 95,9% ад вылучаных імі адпаведна.

Працэнт праходнасці ў склад камісій ад трох апазіцыйных грамадскіх аб’яднанняў (ГА БНФ “Адраджэнне”, ГА “Рух за Свабоду” і ГА “Гавары праўду”), якія таксама вылучалі сваіх прадстаўнікоў у склад камісій, складае 0% у ТВК і 2,8% у АВК.

Пры фарміраванні камісій традыцыйна захаваўся дыскрымінацыйны падыход да прадстаўнікоў апазіцыйных партый: працэнт праходнасці іх прадстаўнікоў у склад камісій застаецца традыцыйна нізкім – 18,75% ад вылучаных у ТВК, 21,2% ад вылучаных у АВК і 4,2% ад вылучаных ва УВК; агульны працэнт іх прадстаўніцтва ў складзе ТВК, АВК і УВК нязначны (2,5% у ТВК, АВК і 0,033% ва УВК).

### Вылучэнне і рэгістрацыя кандыдатаў

Вылучэнне і рэгістрацыя кандыдатаў прайшлі без істотных адрозненняў ад мінулых парламенцкіх выбарчых кампаній; амаль усе ініцыятыўныя групы былі зарэгістраваныя.

Колькасць забароненых месцаў для правядзення пікетаў па зборы подпісаў практычна не змянілася, а ў некаторых рэгіёнах зменшылася; збор подпісаў адбываўся ў спакойнай абстаноўцы, без перашкодаў для ініцыятыўных груп з боку ўлады.

Як і падчас папярэдняй выбарчай кампаніі, пры зборы подпісаў адзначаны выпадкі выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу на карысць праўладных кандыдатаў, чаму спрыяе адсутнасць забароны збіраць подпісы на тэрыторыях прадпрыемстваў і ўстаноў.

Вылучана 703 прэтэндэнты на дэпутацкі мандат, што перавышае паказчык мінулых кампаній (365 – у 2008 г., 464 – у 2012 г., 630 – у 2016 г.); колькасць адмоў у рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты павялічылася ў параўнанні з выбарамі 2016 года (18,9% адмоваў у 2019 г. і 15,1% – у 2016 г.).

На фоне непразрыстай працэдуры праверкі подпісаў зафіксаваная вялікая колькасць адмоў у рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты апазіцыйным актывістам, якія вылучаліся шляхам збору подпісаў; меліся прыкметы злоўжывання пры праверцы дакументаў у асобных ВК, што магло мець на мэце недапушчэнне вядомых апазіцыйных лідараў да ўдзелу ў выбарчай кампаніі.

### Перадвыбарчая агітацыя

Мясцовыя ўлады ў большасці рэгіёнаў стварылі добрыя ўмовы для правядзення перадвыбарчай агітацыі; у параўнанні з выбарамі 2016 г. колькасць месцаў для масавых мерапрыемстваў і колькасць памяшканняў для сустрэч кандыдатаў з выбарцамі павялічылася.

Шырока выкарыстоўваўся адміністрацыйны рэсурс у мэтах спрыяння праўладным кандыдатам у правядзенні перадвыбарчай агітацыі, у той час як для шэрагу незалежных і апазіцыйных кандыдатаў ствараліся перашкоды.

Адзначаны выпадкі нядопуску ў эфір агітацыйных выступаў апазіцыйных кандыдатаў. АВК і кіраўніцтва дзяржаўных СМІ вельмі шырока прымянялі абмежаванні, устаноўленыя арт. 47 ВК, што ў большасці выпадкаў насіла характар цэнзуры і недапушчальнага абмежавання свабоды выказвання меркаванняў; на падставе парушэння патрабаванняў арт. 47 ВК прымаліся рашэнні аб адмене рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты.

Нягледзячы на вялікую колькасць зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты, адзначана іх невысокая актыўнасць у выкарыстанні магчымасцяў вядзення перадвыбарчай агітацыі: 47,7% ад агульнай колькасці зарэгістраваных кандыдатаў удзельнічалі ў тэледэбатах, толькі 58,9% – апублікавалі свае перадвыбарчыя праграмы; 73,9% – выступілі на тэлебачанні, 68,4% – на радыё; у параўнанні з мінулымі выбарамі скарацілася колькасць заяўленых кандыдатамі масавых мерапрыемстваў.

### Датэрміновае галасаванне

Афіцыйная яўка выбаршчыкаў на датэрміновае галасаванне склала 35,77%, што з’яўляецца найбольшым вынікам пры правядзенні парламенцкіх выбараў 2008, 2012, 2016 гг.

Правядзенне датэрміновага галасавання традыцыйна насіла арганізаваны характар: адміністрацыі ВНУ, дзяржаўных прадпрыемстваў і ўстаноў настойліва прапаноўвалі выбаршчыкам прыняць удзел у датэрміновым галасаванні, вялі ўлік прагаласаваўшых і інфармавалі аб яго ходзе мясцовыя выканаўчыя органы ўлады.

У шэрагу выпадкаў арганізацыя ўдзелу выбаршчыкаў у датэрміновым галасаванні насіла прымусовы характар. 30% назіральнікаў адзначылі, што фіксавалі факты прымусу выбаршчыкаў да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні (для параўнання: у 2016 г. пра гэта сведчылі 18% назіральнікаў).

У трыццаці дзвюх УВК, дзе назіральнікі кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” бесперапынна вялі ўлік усіх прагаласаваўшых выбаршчыкаў, назіралася перавышэнне дадзеных пратаколаў УВК ад колькасці, падлічанай назіральнікамі. У некаторых УВК розніца ў дадзеных камісій і назіральнікаў па яўцы выбаршчыкаў на датэрміновым галасаванні насіла анамальны характар – у два, тры, пяць і нават у адзінаццаць разоў болей.

Практыка правядзення датэрміновага галасавання застаецца адной з сістэмных праблем выбарчага працэсу Беларусі і стварае шырокія магчымасці для выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу і іншых маніпуляцый. У сувязі з гэтым рэкамендацыі БДІПЧ АБСЕ ў частцы зменаў працэдур датэрміновага галасавання застаюцца актуальнымі.

**Галасаванне па месцы знаходжання выбаршчыкаў**

Існуючыя працэдуры галасавання па месцы знаходжання выбарцаў даюць магчымасці для маніпуляцый. Назіральнікі не могуць праверыць, ці сапраўды паступалі заяўкі выбаршчыкаў аб арганізацыі галасавання па месцы знаходжання, на практыцы гэта дазваляе арганізаваць такое галасаванне і без заявак. 60% назіральнікаў адзначылі факты ўнясення ў спіс для галасавання па месцы знаходжання асобаў, якія не звярталіся з такой просьбай.

На некаторых участках зафіксавана анамальна высокая колькасць прагаласаваўшых па месцу знаходжання.

**Галасаванне на выбарчых участках і падлік галасоў**

У ВК адсутнічае апісанне працэдуры падліку выбарчых бюлетэняў. Рэкамендацыі БДІПЧ АБСЕ і прапановы кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” аб урэгуляванні гэтай працэдуры праз пастанову ЦВК пры падрыхтоўцы выбараў не былі ўлічаны.

Як і падчас папярэдніх выбарчых кампаній, УВК ажыццяўлялі сумесны і адначасовы падлік бюлетэняў, не агалошваючы і не дэманструючы ўсім прысутным кожны выбарчы бюлетэнь. Такая працэдура падліку бюлетэняў не з’яўляецца празрыстай і не дазваляе суаднесці вынікі назірання за падлікам галасоў з дадзенымі, адлюстраванымі ў пратаколе аб выніках галасавання. 98,7% назіральнікаў кампаніі адзначылі, што працэдура падліку галасоў насіла непразрысты характар. Падчас назірання за парламенцкімі выбарамі 2016 г. гэтая лічба склала 95,31%.

Падчас назірання за працэдурай падліку галасоў назіральнікамі кампаніі адзначаліся і іншыя парушэнні працэдур падліку: у 35% УВК, у якіх ажыццяўлялася назіранне, не агалошваліся вынікі асобнага падліку галасоў, у 47% УВК падлік бюлетэняў не ажыццяўляўся асобна за кожнага кандыдата, у 63,7% УВК назіральнікі знаходзіліся ў нязручным для ажыцяўлення назірання за падлікам галасоў месцы.

## УВОДЗІНЫ

Кампанія “Праваабаронцы за свабодныя выбары” – незалежная і палітычна незаангажаваная сумесная ініцыятыва Праваабарончага цэнтра “Вясна” і

Рэспубліканскага праваабарончага грамадскага аб’яднання “Беларускі Хельсінкскі Камітэт”.

Мэта кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” – назіранне за выбарамі ўсіх узроўняў у Рэспубліцы Беларусь, ацэнка выбарчага працэсу з пункту гледжання беларускага выбарчага заканадаўства і міжнародных стандартаў свабодных і дэмакратычных выбараў, інфармаванне беларускай грамадскасці і міжнароднай супольнасці пра вынікі назірання.

З першага дня выбараў у межах кампаніі дзейнічала 42 доўгатэрміновыя назіральнікі, прадстаўніцтва якіх у АВК дазваляе ахапіць працэс волевыяўлення больш за 50% выбаршчыкаў краіны. Вынікі апрацоўкі штотыднёвых справаздач назіральнікаў распаўсюджваліся ў форме тыднёвых справаздач кампаніі і справаздач кампаніі па асобных этапах выбараў.

Падчас датэрміновага галасавання назіранне ажыццяўлялася на 94 УВК, а ў дзень выбараў на 204 УВК па ўсёй тэрыторыі краіны. Справаздачы апрацоўваліся штодзённа, гэта дазволіла выявіць агульныя тэндэнцыі ў арганізацыі выбарчага працэсу і ацаніць узровень парушэнняў ВК.

## УМОВЫ НАЗІРАННЯ

Міжнароднае назіранне ў Беларусі традыцыйна было прадстаўлена Назіральнай місіяй Міжпарламенцкай Асамблеі СНД, Міжнароднай місіяй БДІПЧ АБСЕ, місіяй Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ), місіяй Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (ПА АБСЕ) прадстаўнікамі дыпламатычнага корпусу ў Рэспубліцы Беларусь, выбарчых органаў замежных дзяржаваў, Шанхайскай Арганізацыяй Садружнасці. Усяго, паводле дадзеных ЦВК, па стане на 17 лістапада 2019 г. у краіне было акрэдытавана 1030 замежных (міжнародных) назіральнікаў.

Акрамя кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары», нацыянальнае назіранне ажыццяўляла таксама кампанія «Права выбару», якая аб’яднала восем палітычных суб’ектаў і з’яўляецца назіраннем з боку апазіцыйных палітычных партый і рухаў.

Некаторыя праўладныя грамадскія аб’яднанні і палітычныя партыі (Белая Русь, БРСМ, Беларускі саюз жанчын, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі і інш.) традыцыйна вылучылі вялікую колькасць назіральнікаў. Агулам у выбарчых камісіях усіх узроўняў было акрэдытавана 38 878 нацыянальных назіральнікаў.

Усе назіральнікі кампаніі былі дапушчаныя да назірання за галасаваннем, аднак некаторыя з іх сутыкаліся з перашкодамі ў ажыцяўленні назірання: забаронай ажыцяўляць фота- і відэаздымку, у тым ліку забаронамі фотафіксацыі афіцыйных пратаколаў УВК аб штодзённых выніках датэрміновага галасавання, вынясенне

неабгрунтаваных папярэджанняў з боку УВК і інш. Зафіксаваныя факты пазбаўлення акрэдытацыі і выдалення з участкаў для галасавання назіральнікаў ад апазіцыйных палітычных партый, а таксама 5-ці назіральнікаў кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары”.

Старшыня УВК № 2 АВК № 2 у Брэсце Таццяна Каваленка забараніла фатаграфаванне копіі пратакола аб прагаласаваўшых за дзень. Старшыня УВК № 3 АВК № 51 у Гродне забараніла назіральнікам падыйсці бліжэй да камісіі, каб непасрэдна назіраць за падлікам колькасці прагаласаваўшых на ўчастку. У УВК № 2 АВК № 28 у Верхнядзвінску ў апошні дзень датэрміновага галасавання 16 лістапада старшыня камісіі Г. Васёха ў 19.00 папрасіла ўсіх пакінуць памяшканне, і назіральнік не змог азнаёміцца з выніковым пратаколам датэрміновага галасавання.

У Мінску назіральнік Аляксей Лойка ў УВК № 390 атрымаў папярэджанні ад АВК № 102 і УВК за тое, што сфатаграфаваў пратаколы датэрміновага галасавання і абстаноўку каля ўчастка падчас назірання. Назіральнік у Брэсце Юрый Вашчанчук быў пазбаўлены акрэдытацыі ў УВК за тое, што зафіксаваў на відэа відавочную спробу ўкіду некалькіх бюлютэняў ў скрыню для галасавання ў УВК № 37. Добрасумленныя і карэктныя дзеянні назіральніка нечакана выклікалі рэзка негатыўную рэакцыю з боку старшыні ЦВК Лідзіі Ярмошынай, якая патрабавала пазбаўлення яго акрэдытацыі. Сітуацыя набыла досыць вялікі рэзананс і абмяркоўвася ў дзяржаўны СМІ, а 17 лістапада пра гэты выпадак публічна выказаўся сам А. Лукашэнка, які адзначыў, што сказаў спецслужбам і міліцыі, каб яны цвёрда спынялі падобныя выпадкі: “Жорстка – гэта значыць, калі нейкі мудак або прыдурак пачынае кідацца на выбаршчыкаў, сказаць, што яму ўставілі мазгі так, каб больш гэтага не хацелася”.[1] Такая заява кіраўніка дзяржавы выклікае заклапочанасць і ўспрымаецца як пагроза пераследу назіральнікаў у сувязі з ажыццяўленнем імі законнай дзейнасці па назіранню за выбарамі.

У г. Магілёве з УВК былі выдаленыя назіральнікі кампаніі Б. Бухель і А. Колчын за спробу зрабіць фота і відэа здымкі падчас галасавання і падліку галасоў, а ў г. Гомеле быў выдалены назіральнік А. Стрыжак.

## ПРАВАВАЯ БАЗА

Выбарчая сістэма Рэспублікі Беларусь рэгулюецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Выбарчым кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, а таксама пастановамі Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў. Некаторыя пытанні таксама вырашаюцца выданнем актаў мясцовых органаў улады.

[1] Даступна тут: https://nn.by/?c=ar&i=241172

Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь (арт. 91) і Выбарчага кодэкса (арт. 56), “Выбары ў Палату прадстаўнікоў новага склікання прызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь не пазней за чатыры месяцы і праводзяцца не пазней за 30 дзён да заканчэння паўнамоцтваў Палаты прадстаўнікоў дзеючага склікання».

Канстытуцыяй (арт. 93) усталяваны чатырохгадовы тэрмін паўнамоцтваў Парламента. Паўнамоцтвы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу шостага склікання, абранай у 2016 годзе, заканчваюцца ў кастрычніку 2020 года. Аднак ў канцы красавіка 2019 года А. Лукашэнка ў пасланні прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу паведаміў пра тое, што выбары ў Палату прадстаўнікоў адбудуцца ў лістападзе 2019 года. З улікам гэтага ўказання ЦВК 29 мая на сваім пасяджэнні зацвердзіла сярэднюю колькасць выбаршчыкаў на выбарчую акругу, якая па Выбарчым кодэксе ўстанаўліваецца не пазней пяці месяцаў да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў Палаты прадстаўнікоў дзеючага склікання.

Прызначэнне выбараў адбылося 5 жніўня 2019 года, калі прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў указ № 294 аб прызначэнні выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу на 17 лістапада 2019 года.

Паколькі падстаў для датэрміновага спынення паўнамоцтваў Парламента, прадугледжаных арт. 94 Канстытуцыі, няма, а чатырохгадовы тэрмін яго паўнамоцтваў не мінуў, гэты ўказ парушае канстытуцыйную норму пра тэрмін паўнамоцтваў Парламента і з'яўляецца ўмяшальніцтвам у дзейнасць органа заканадаўчай улады. Істотнае скарачэнне тэрміну паўнамоцтваў Палаты прадстаўнікоў паменшыла колькасць сесій заканадаўчага органа да сямі (ПП НС чацвёртага склікання правяла 11 сесій, пятага склікання – 10 сесій).

6 жніўня 2019 года адбылося пасяджэнне Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, на якім былі разгледжаны пытанні падрыхтоўкі выбараў.

Выбары у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання ў асноўным прайшлі па тых жа правілах, што і папярэднія ў 2016 годзе. Апошнія змены ў Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь былі унесены Законам Рэспублікі Беларусь ад 4 чэрвеня 2015 года № 268-З. Яны канкрэтызавалі і пашырылі сферу забароны замежнага фінансавання выбарчага працэсу. Раней Законам Рэспублікі Беларусь ад 25 лістапада 2013 г. № 72-З унесены змены ў ВК, якія закранулі парадак дзяржаўнага фінансавання агітацыі, увялі акрэдытацыю назіральнікаў, прадугледзелі стварэнне абласных, Мінскай гарадской, тэрытарыяльных выбарчых камісій, якія, у тым ліку, кіруюць дзейнасцю акруговых і ўчастковых выбарчых камісій, разглядаюць скаргі на іх рашэнні, вызначаюць вынікі выбараў дэпутатаў на тэрыторыі вобласці і г. Мінска. Прадугледжана таксама накіраванне палітычнымі партыямі, якія вылучылі сваіх кандыдатаў у Палату прадстаўнікоў, сябраў акруговых выбарчых камісій з дарадчым голасам. З таго часу забаронена агітацыя за байкот выбараў пад пагрозай прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці; замацаваныя

падставы, на якіх можа быць адмоўлена ў рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты; прадугледжаны толькі адзін тур галасавання: перамагае той кандыдат, які набраў большасць галасоў грамадзян, што ўзялі ўдзел у галасаванні.

4 студзеня 2014 г. Рэспубліка Беларусь далучылася да Канвенцыі аб стандартах дэмакратычных выбараў, выбарчых правоў і свабод дзяржаў-удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, падпісанай 7 кастрычніка 2002 года ў г. Кішынёў. Фактам ратыфікацыі Канвенцыі Рэспубліка Беларусь абавязалася «прымаць заканадаўчыя і іншыя меры ў мэтах узмацнення гарантый выбарчых правоў і свабод для падрыхтоўкі і правядзення дэмакратычных выбараў, рэалізацыі палажэнняў дадзенай Канвенцыі».

З улікам агаворкі Беларусь не прымала абавязацельстваў па змене неадпаведных Канвенцыі абмежаванняў, замацаваных Канстытуцыяй дзяржавы. Гэта азначае адсутнасць абавязацельстваў па змяненні, напрыклад, нормы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якая парушае прынцып усеагульнага выбарчага права (у адпаведнасці з арт. 64 адвольна пазбаўленыя актыўнага выбарчага права асобы, зняволеныя пад варту па абвінавачванні ў здзяйсненні злачынства).

Разам з тым, да цяперашняга часу не імплементаванымі ў выбарчае заканадаўства засталіся многія іншыя палажэнні Канвенцыі, якія не супярэчаць беларускай Канстытуцыі. Так, нормы аб забароне агітацыі за байкот выбараў відавочна супярэчаць Канвенцыі, якая прадугледзела, што байкот ці заклікі да байкоту выбараў з’яўляюцца формамі вольнага ажыццяўлення грамадзянамі іх выбарчых правоў і свабод, а перашкода ажыццяўленню гэтых правоў павінна пераследвацца па законе.

Не рэалізаваная прызнаная Канвенцыяй магчымасць прадастаўлення кандыдату, палітычнай партыі, якая вылучыла спіс кандыдатаў, права прызначаць ва УВК па аднаму члену выбарчага органа з правам дарадчага голасу, які прадстаўляе кандыдата ці палітычную партыю.

Па-ранейшаму нявызначанай засталася юрыдычная сіла пастаноў ЦВК, у той час як па Канвенцыі рашэнні выбарчых органаў, прынятыя ў межах іх кампетэнцыі, павінны быць “абавязковыя для органаў выканаўчай улады, дзяржаўных устаноў, органаў мясцовага самакіравання, палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў, іх упаўнаважаных прадстаўнікоў, арганізацый, службовых асобаў, выбаршчыкаў, ніжэйшых выбарчых органаў, іншых асоб і арганізацый, указаных у законах».

Не ў поўнай меры ў выбарчым заканадаўстве рэалізаваны прынцып празрыстасці фінансавання выбарчых кампаній: ні законам, ні на практыцы на кандыдатаў не ўскладзены абавязак даць справаздачу не аб агульных сумах, але і аб «паступленні усіх ахвяраванняў у свае грашовыя выбарчыя фонды, аб укладчыках адпаведных сродкаў».

Безумоўным парушэннем Канвенцыі з'яўляецца непрыняцце дзяржавай мер, якія забяспечваюць для назіральнікаў магчымасць “назіраць за падлікам галасоў выбаршчыкаў ва ўмовах, якія забяспечваюць агляднасць працэдуры падліку бюлетэняў”, а таксама магчымасць “атрымліваць у выпадках і парадку, які

прадугледжаны нацыянальным заканадаўствам, ад адпаведнага выбарчага органа завераныя копіі названых пратаколаў".

Як і на папярэдніх парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбарах, Цэнтральная выбарчая камісія захавала практыку выбарачнай публікацыі пастаноў ЦВК, якая з'яўляецца сумнеўнай з пункту гледжання забеспячэння прынцыпу галоснасці ў працэсе выбараў. Так, на дзень выбараў было апублікавана 27 з 61 прынятых пастаноў ЦВК.

Сваімі пастановамі ЦВК увяла шэраг новых нормаў, якія ўдасканальваюць некаторыя аспекты выбарчага працэсу і прадугледжваюць дадатковыя меры па паляпшэнні даступнасці выбарчай кампаніі для людзей з інваліднасцю. Таксама знята татальная забарона для назіральнікаў рабіць фотаздымкі на выбарчым участку. Аднак гэта нельга ацэньваць як пашырэнне правоў назіральнікаў і ўзмацненне гарантый галоснасці пры правядзенні выбараў, паколькі метадычным дапаможнікам прадугледжана магчымасць «дазваляць назіральнікам па іх просьбе зрабіць некалькі фотаздымкаў», што істотна абмяжоўвае правы назіральнікаў у выкарыстанні фота- і відэаздымкі для фіксацыі парушэнняў на выбарчым участку.

Але самы адчувальны момант выбарчай кампаніі, які заўжды выклікаў асаблівую крытыку назіральнікаў, а менавіта, парадак падліку галасоў, як і раней застаўся не дэталізаваным ні ў метадычных дапаможніках, ні ў пастановах ЦВК. Нязменнасць гэтага моманту з кампаніі ў кампанію паказвае незацікаўленасць ЦВК у арганізацыі празрыстага падліку галасоў.

Варта нагадаць, што яшчэ ў 2015 годзе па выніках прэзідэнцкіх выбараў БДІПЧ АБСЕ былі распрацаваныя прапановы па ўдасканаленні выбарчых працэсаў. Для вывучэння рэкамендацый БДІПЧ АБСЕ і разгляду магчымасцяў іх імплементацыі ў выбарчы працэс 12 лютага 2016 года па даручэнні Аляксандра Лукашэнкі была створана міжведамасная экспертная група. Па выніку працы ЦВК улічыла 2 прапановы з 30. 31 студзеня 2017 года Міжведамасная экспертная рабочая група разглядзела рэкамендацыі БДІПЧ АБСЕ па пытаннях удасканалення выбарчага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь па выніках назірання на парламенцкіх выбарах. На паседжанні рабочай групы былі агучаныя Прыярытэтныя рэкамендацыі аб унясенні зменаў у выбарчае заканадаўства Беларусі, прадстаўленыя экспертамі кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары". Аднак, па словах спецпрадстаўніка ПА АБСЕ Кента Харстэда, які на папярэдніх прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбарах быў спецыяльным каардынатарам місіі кароткачасовых назіральнікаў АБСЕ, працэс разгляду рэкамендацый завершаны, і ўлады не плануюць іх выконваць[2].

[2] Даступна тут: https://naviny.by/article/20180124/1516802727-kent-harsted-belarus-hochet-chtoby-v-obse-udelyali-bolshe-vnimaniya

## ВЫБАРЧЫЯ КАМІСІІ

Змены ў ВК 2013 года ўвялі дадатковы ўзровень выбарчых камісій пры правядзенні парламенцкіх выбараў – гэта тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі (ТВК – абласныя і Мінская гарадская тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі). Акрамя ВК, працэс стварэння камісій рэгуляваўся пастановай ЦВК ад 6 жніўня 2019 г. № 23 “Аб растлумачэнні парадку ўтварэння выбарчых камісій пры правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання”. Як і на папярэдніх выбарах у парламент, ЦВК прадугледзела нормы адносна працэдуры фарміравання камісій: перад прыняццем рашэння аб утварэнні выбарчай камісіі на пасяджэнні органаў, якія іх утвараюць, на абмеркаванне выносіцца пытанне аб дзелавых і асабістых якасцях прэтэндэнтаў. У выпадках, калі колькасць вылучаных у камісіі перавышае прадугледжаную колькасць сябраў камісій, павінна заслухоўвацца інфармацыя па кожнай кандыдатуры і праводзіцца персанальнае галасаванне.

Згодна з арт. 34 ВК, абласныя, Мінская гарадская тэррытарыяльныя і акружныя камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў фарміруюцца прэзідыумамі абласных, Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і абласнымі, Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтамі з прадстаўнікоў палітычных партый, іншых грамадскіх аб’яднанняў, працоўных калектываў, а таксама прадстаўнікоў грамадзянаў, вылучаных у склад камісіі шляхам падачы заявы, у складзе 9-13 сябраў. УВК фарміруюцца раённымі, гарадскімі выканаўчымі камітэтамі, а ў гарадах з раённым падзелам – мясцовымі адміністрацыямі ў складзе 5 –19 членаў.

Палітычная партыя, іншае рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне, працоўны калектыў арганізацыі, калектыў структурнага падраздзялення, група выбаршчыкаў мае права вылучыць у выбарчую камісію толькі па адным прадстаўніку. Як правіла, не менш адной трацiны складу камісіі складаюць прадстаўнікі палітычных партый і іншых грамадскіх аб’яднанняў. У склад камісіі не могуць уваходзіць суддзі, пракуроры, кіраўнікі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Дзяржаўныя служачыя не могуць складаць больш за адну трацiну складу камісіі.

Магчымасці вылучэння ў склад УВК ад палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў, як і раней, абмяжоўваюцца патрабаваннем наяўнасці ў іх мясцовых арганізацыйных структур. Такім чынам, партыі і рэспубліканскія грамадскія аб'яднанні, якія не маюць арганізацыйных структур у абласцях і ніжэйстаячыя арганізацыйныя структуры, наогул пазбаўленыя магчымасці вылучаць сваіх прадстаўнікоў у склад участковых выбарчых камісій.

Рашэнне органа, які ўтварыў камісію, можа быць абскарджана ў трохдзённы тэрмін з дня яго прыняцця адпаведна ў абласны, Мінскі гарадскі, раённы, гарадскі суд суб’ектамі, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі. Суд разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з’яўляецца канчатковым.

Па дадзеных ЦВК, рознымі суб’ектамі у склад 7 ТВК вылучана 143 прадстаўнікі, у 110 АВК вылучана 1959 чалавек, у склад 5 785 УВК былі вылучаны 67 660 кандыдатур.









Працэнт вылучаных прадстаўнікоў, падлічаны ад колькасці вылучэнняў, не супадае з колькасцю вылучаных асобаў: у АВК 170 грамадзянаў былі вылучаны двума суб'ектамі. З іх у Брэсцкай вобласці – 1; ў Гомельскай вобласці – 1; а ў Гродзенскай вобласці – 168. Як паведаміў назіральнік кампаніі, амаль кожны з праўладных прэтэндэнтаў там быў вылучаны адначасова двума суб’ектамі. У ТВК Гродзенскай вобласці 13 грамадзянаў былі вылучаны двума суб'ектамі.

З 15 зарэгістраваных у краіне палітычных партый сваіх прадстаўнікоў у склад АВК вылучылі 12, у тым ліку 5 апазіцыйных: Беларуская партыя «Зялёныя», Беларуская партыя левых «Справядлівы свет», Аб'яднаная грамадзянская партыя, Партыя БНФ, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада). Усяго, паводле звестак ЦВК, апазіцыйныя партыі вылучылі 146 прадстаўнікоў – 38,9% ад вылучаных партыямі і 7,45% ад агульнай колькасці прадстаўнікоў, вылучаных у склад АВК. У ТВК ад пяці апазіцыйных партый былі вылучаны 16 прадстаўнікоў – 4% ад вылучаных партыямі і 11,2% ад агульнай колькасці кандыдатаў, вылучаных у склад ТВК. Ва УВК былі вылучаны 495 прадстаўнікоў апазіцыйных партый – 11,3% ад вылучаных ад партый ці 0,7% ад агульнай колькасці вылучаных.

Як і на папярэдніх выбарах, традыцыйна актыўна бяруць удзел у фарміраванні камісій прадстаўнікі вялікіх праўладных ГА і прафсаюзаў.

На гэтых выбарах акрамя асобных дадзеных па вылучэнні прадстаўнікоў ГА «Белая Русь», ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», прафсаюзаў – сябраў праўладнай Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Беларускага саюзу жанчын і Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў, ЦВК таксама падлічыла колькасць прадстаўнікоў Беларускага фонду міру. Разам гэтыя вялікія праўладныя ГА выставілі для ТВК 29% ад усіх вылучаных (70,6% – ад вылучаных ГА і прафсаюзамі), для АВК – 40,1% ад усіх кандыдатаў (74,6% ад вылучаных ГА і прафсаюзамі), для УВК – 42,8% ад усіх вылучаных (88,8% ад вылучаных ГА і прафсаюзамі).

У вылучэнні сваіх прадстаўнікоў у АВК і ТВК не ўдзельнічалі Кансэрватыўна-Хрысціянская партыя – БНФ, Партыя “Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада” і Рэспубліканская партыя. КХП БНФ і “Зяленыя” не прэтэндавалі на месцы ва УВК. Сваіх прадстаўнікоў у АВК і ТВК накіравалі ГА “Рух “За свабоду” (117), ГА “Гавары праўду” (36) і ГА БНФ “Адраджэньне” (4).

Назіральнікі паведамлялі, што галасаванне ў большасці выпадкаў насіла фармальны характар, хоць і ў абсалютнай большасці выпадкаў пры фарміраванні ТВК і АВК суправаджалася абмеркаваннем вылучаных прэтэндэнтаў. У падтрымку прадстаўнікоў праўладных палітычных партый і грамадскіх аб’яднанняў галасавалі практычна адзінагалосна, а за прадстаўнікоў апазіцыйных партый выказваліся амаль адзінагалосна супраць. Часам прычыны адмоваў ва ўключэнні прадстаўнікоў апазіцыйных партый у камісіі гучалі абсурдна. Так, напрыклад на пасяджэнні па фармаванні УВК Маскоўскага раёна г. Брэста ў склад камісій не быў уключаны ніводны прадстаўнік апазіцыі. Прычыны па кожнай персаналіі называліся наступныя: Кузміч ад партыі БНФ – адмовілі, бо “не знайшлі інфармацыі аб ягоных дзелавых якасцях”; Леўко ад партыі БНФ – адмовілі “каб не адцягваць яго ад працы, бо ён цэнны работнік”; Дзенісенка ад БПЛ “Справядлівы свет” – адмовілі, “уключаць у наступны раз”; Машкевіч ад БСДП “Грамада” – адмовілі, “не змаглі звязацца, для ўдакладнення дадзеных”; Чапурных ад БПЛ “Справядлівы свет” – адмовілі, “рабочая група даведалася, што ён пасля аперацыі”; Вакуленка ад БСДП “Грамада” – адмовілі, “нідзе не працуе”.

Пры фармаванні УВК у большасці выпадкаў (77,5%) абмеркавання вылучаных у склад камісій прэтэндэнтаў не адбывался. У палове выпадкаў (50%) прапанаваныя ў склад камісій асобы прадстаўляліся, і ім даваліся (агучваліся) характарыстыкі іх асабістых і дзелавых якасцяў. У 52,5% выпадкаў галасаванне адбывалася за загадзя вызначаны спіс прэтэндэнтаў без абмеркавання кандыдатур. У асноўным гэта датычылася тых УВК, у якіх не было конкурсу (колькасць вылучаных супадала з колькасцю месцаў у камісіі) і ўсе вылучаныя былі ўключаныя ў склад камісій.

Такім чынам, працэс фарміравання камісій насіў загадзя вызначаны характар. У большасці выпадкаў назіральнікі кампаніі адзначылі немагчымасць азнаёміцца з матэрыяламі вылучэння ў склад камісій усімі зацікаўленымі суб’ектамі ўключна з самімі назіральнікамі.

У склад сямі ТВК былі абраныя 91 чалавек, альбо 63,6% ад вылучаных. У склад 110 АВК былі абраныя 1430 чалавек, альбо 73% ад вылучаных. У склад 5 785 УВК увайшлі 94% ад агульнай колькасці прэтэндэнтаў – 63 646 чалавек.

У большасці выпадкаў назіральнікі адзначаюць “вытворчы прынцып” фармавання УВК, калі сябры камісіі прадстаўляюць адзін і той жа працоўны калектыў, а іх непасрэдныя начальнікі з’яўляюцца старшынямі гэтых выбарчых камісій.

Ад пяці вялікіх праўладных ГА і прафсаюзаў у склад ТВК уключана 39 прадстаўнікоў, гэта 42,9% ад колькасці сябраў ТВК; у склад АВК уключана 735 прадстаўнікоў –

51,4% ад колькасці сябраў АВК; у склад УВК уключана 27 790 прадстаўнікоў – 43,7% сябраў УВК.




| | Ад пяці ГА і прафсаюзаў | Ад апазіцыйных ГА | Ад праўладных партый | Ад апазіцыйных партый | У сярэднім |
|---|---|---|---|---|---|
| У складзе ТВК | 92,9% | 0,0% | 69,6% | 18,8% | 63,6% |
| У складзе АВК | 93,6% | 2,8% | 73,8% | 21,2% | 73,0% |
| У складзе ЎВК | 95,9% | 0,0% | 96,9% | 4,2% | 94,0% |

Доля прадстаўнікоў палітычных партый у складзе выбарчых камісій па-ранейшаму застаецца нязначнай: 12 палітычных партый, уключаючы пяць апазіцыйных, вылучылі 25,0 % прадстаўнікоў у ТВК, 17,6% у АВК і 6,5% у УВК. Толькі 34

прадстаўнікі апазіцыйных партый былі ўключаныя ў камісіі ўсіх узроўняў. Як ніколі раней з апошніх чатырох парламенцкіх кампаній малая доля прадстаўнікоў апазіцыйных партый ў складзе УВК: толькі 21 з 495 вылучаных былі ўключаныя ў камісіі (0,03% ад складу УВК). Па-за складам камісій апынуліся ўсе 54 вылучэнцы БСДГ (Грамада).

Такім чынам, прадстаўнікі апазіцыйных партый былі толькі ў 21 з 5 785 УВК па ўсёй краіне, што не пакінула апазіцыі шанцаў уплываць на свабоду і празрыстасць асноўных выбарчых працэдур, у тым ліку, на падлік галасоў выбаршчыкаў.




## ВЫЛУЧЭННЕ І РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ

Паводле дадзеных ЦВК[3], пададзеныя 503 заявы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп. 2 заявы былі адкліканы да рэгістрацыі. Па 14 заявах прынята рашэнне аб адмове ў рэгістрацыі, што складае 2,7% ад агульнай колькасці пададзеных заяў. Гэта істотна менш у параўнанні з выбарамі 2016 г.

| Год выбараў | Пададзена заяў | Зарэгістравана | Адмоўлена ў рэгістрацыі | % адмоваў |
|---|---|---|---|---|
| 2008 | 455 | 423 | 23 | 5% |
| 2012 | 440 | 354 | 85 | 19,3% |
| 2016 | 497 | 446 | 30 | 6,2% |
| 2019 | 503 | 487 | 14 | 2,7% |

[3] Даступна на: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/stat10.pdf




З агульнай колькасці асоб, чые ініцыятыўныя групы былі зарэгістраваныя, членамі партый з'яўляюцца 115 чалавек (23,6%), што менш у параўнанні з выбарамі 2016 г. (160 чалавек, ці 33%). Больш за ўсё зарэгістравана ініцыятыўных груп прадстаўнікоў КПБ – 28 (5,7% ад колькасці партыйных вылучэнцаў шляхам збору подпісаў), АГП – 27 (5,5%), Партыі БНФ – 16 (3,3%), БПЛ «Справядлівы свет» – 17 (3,5%).

### *Збор подпісаў*

У межах падрыхтоўкі да збору подпісаў мясцовыя ўлады прынялі рашэнні, якім вызначылі месцы, забароненыя для правядзення пікетаў па зборы подпісаў. Па звестках большасці назіральнікаў, колькасць забароненых месцаў засталася той жа, што і падчас папярэдняй выбарчай кампаніі, ці нават зменшылася. Не зафіксаваныя значныя перашкоды ў працы сяброў ініцыятыўных груп.

Пры зборы подпісаў заўважаны выпадкі выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу з боку праўладных вылучэнцаў. Так, студэнты УА "Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт" збіралі подпісы ў навучальны час, а таксама ў інтэрнаце за прарэктара гэтай навучальнай установы па выхаваўчай працы Паўла Папко, які вылучаўся па Баранавіцкай-Усходняй ВА № 6.

За Валянціну Назаранка – старшыню Мазырскага раённага Савета дэпутатаў, якая вылучалася па Мазырскай ВА № 42, збіралі подпісы ў абедзенны час на прахадной аднаго з прадпрыемстваў, што пацвердзіла сама вылучэнка ў размове з назіральнікам у адказ на пытанне, як можна за адзін дзень сабраць подпісы 16 выбаршчыкаў, якія пражываюць у розных мікраараёнах горада.

Пры зборы подпісаў за старшыню першаснай прафсаюзнай арганізацыі ААТ "Беларуськалій" Андрэя Струнеўскага, які вылучаецца па Салігорскай гарадской ВА

№ 68, работнікаў прадпрыемства, якія працуюць па тэрміновых кантрактах, запрашалі ў аддзелы кадраў структурных падраздзяленняў, дзе яны ставілі подпісы ў загаддзя запоўненыя падпісныя лісты з пашпартнымі дадзенымі работніка. Адзначаны і іншыя формы адміністрацыйнага прымусу: супрацоўнікаў прасілі прыходзіць на працу з пашпартамі і падпісвацца за праўладных кандыдатаў, настаўнікаў школы часта далучалі да працы ініцыятыўных груп, паставіўшы іх перад фактам, і інш.

***Вылучэнне кандыдатаў***

Паводле дадзеных ЦВК[4], у сёлетняй выбарчай кампаніі вылучана 703 прэтэндэнты на дэпутацкі мандат, што перавышае паказчык папярэдняй выбарчай кампаніі (630). Сярод прэтэндэнтаў больш за ўсё вылучэнцаў ад палітычных партый (424). 272 прэтэндэнты былі вылучаныя грамадзянамі шляхам збору подпісаў. Найменш было вылучана працоўнымі калектывамі (128)[5].




Партыйнае прадстаўніцтва сярод вылучэнцаў кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў у колькасных адносінах склала 424 асобы, што значна перавышае адпаведны паказчык у кампаніі 2016 г. (387 асоб). Параўнанне сёлетніх дадзеных з дадзенымі кампаніі 2016 г. паказвае змену суадносінаў колькасці кандыдатаў ад праўладных і апазіцыйных партый. Нягледзячы на агульную большую колькасць вылучаных кандыдатаў, апазіцыйных прадстаўнікоў стала колькасна менш.

[4] Даступна тут: http://www.rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/stat11.pdf

[5] Частка прэтэндэнтаў вылучаны двума і трыма суб'ектамі.




Рэйтынг партый-лідараў па колькасці вылучэнцаў выглядае наступным чынам:




Заўважана тэндэнцыя да павелічэння прадстаўніцтва дзейсных парламентарыяў і прадстаўнікоў мясцовай улады. У 2016 г. было вылучана 28 дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і 51 дэпутат мясцовых Саветаў дэпутатаў. У 2019 г. паўторна

балатуюцца 34 дзеючыя дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і 58 дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Колькасць жанчын сярод вылучаных кандыдатамі ўзрасла з 23% у 2016 г. да 25% у 2019 г.

***Рэгістрацыя кандыдатаў***

Праверка подпісаў выбаршчыкаў з'яўляецца важнай працэдурай, падчас якой высвятляецца іх сапраўднасць. ВК не прадугледжвае прамога права назіральнікаў прысутнічаць падчас праверкі подпісаў, аднак гэта вынікае з прынцыпу галоснасці і адкрытасці падрыхтоўкі і правядзення выбараў, замацаванага ў арт. 13 ВК.

Большасці назіральнікаў (71%), якія звярталіся ў АВК з просьбай дапусціць іх да назірання за працэдурай праверкі сапраўднасці подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах, адмовілі. Аргументацыя была наступная: "праверка подпісаў з'яўляецца рабочым момантам працы АВК"; "назіральнікі маюць права прысутнічаць толькі на пасяджэннях камісіі, а праверка подпісаў праводзіцца не на пасяджэнні", "прысутнасць назіральнікаў пры праверцы подпісаў не прадугледжана заканадаўствам".

Пра адсутнасць адзіных падыходаў у працы АВК сведчыць тое, што некаторыя АВК (29% з ліку тых, на якіх вялосся назіранне) усё ж дапусцілі назіральнікаў да гэтай працэдуры. Гэта адбылося, напрыклад, у АВК Баранавіцкай-Усходняй ВА № 6, АВК Смаргонскай выбрачай акругі № 59, АВК Аршанскай-Дняпроўскай выбрачай акругі № 26, АВК Светлагорскай выбрачай акругі № 46, АВК Салігорскай Гарадской ВА № 68, АВК Гомельскай-Прамысловай ВА № 35, АВК Бабруйскай Сельскай ВА № 80 і інш.




Аднак фармальны допуск назіральнікаў не стварыў большай празрыстасці працэдуры праверкі подпісаў, паколькі назіральнікі не мелі магчымасці бачыць усе аспекты дадзенай працэдуры.

Па дадзеных назіральнікаў, у большасці АВК праверка дадзеных анкет і дэкларацый аб даходах і маёмасці адбывалася непразрыста і негалосна. Адбор подпісаў для праверкі, сама праверка подпісаў выбаршчыкаў і дакументаў, неабходных для рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты, па-ранейшаму застаецца непразрыстай і дазваляе маніпуляваць у той ці іншы бок.

Паводле дадзеных ЦВК[6], з 703 асобаў, вылучаных кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, зарэгістравана 560. 12 заяваў аб рэгістрацыі былі адкліканы. 131 чалавеку было адмоўлена ў рэгістрацыі, што складае каля 19% ад агульнай колькасці разгледжаных пакетаў дакументаў. У тым ліку адмоўлена ў рэгістрацыі 55 прадстаўнікам ПАГА «Рух «За Свабоду», якія вылучыліся рашэннем канферэнцыі аб'яднання не ў адпаведнасці з Выбарчым кодэксам. Адмова ў рэгістрацыі прадстаўнікам Руху «За Свабоду», якія вылучаліся такім шляхам, абгрунтоўвалася тым, што ў адпаведнасці з ч. 3 арт. 60 ВК вылучаць кандыдатаў маюць права толькі палітычныя партыі, працоўныя калектывы і грамадзяне шляхам збору подпісаў.

| Год выбараў | Вылучана кандыдатаў | Адклікана заяў | Адмоўлена ў рэгістрацы | Зарэгістравана | % адмоваў[7] |
|---|---|---|---|---|---|
| 2008 | 365 | 5 | 84 | 276 | 23,3% |
| 2012 | 494 | 9 | 122 | 363 | 25,1% |
| 2016 | 630 | 16 | 93 | 521 | 15,1% |
| 2019 | 703 | 12 | 131 | 560 | 18,9%[8] |

Зарэгістравана 357 чалавек, якія вылучаліся палітычнымі партыямі, што складае 84% ад агульнай колькасці вылучаных (424), ці 64% ад агульнай колькасці зарэгістраваных.

Вынікі рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты вылучэнцаў палітычных партый:

| Палітычная партыя | Колькасць вылучаных | Колькасць зарэгістраваных | % адмоваў у рэгістрацыі |
|---|---|---|---|
| Беларуская партыя "Зялёныя" | 7 | 4 | 43% |
| Беларуская партыя левых "Справядлівы свет" | 33 | 27 | 18% |
| Беларуская патрыятычная партыя | 16 | 10 | 37% |
| Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) | 41 | 30 | 22% |
| Беларуская сацыяльна-спартыўная партыя | 1 | 1 | 0 |

[6] Па стане на 18 кастрычніка. Даступна тут: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/stat13.pdf

[7] Ад агульнай колькасці вылучаных без тых, хто адклікаў заявы аб рэгістрацыі

[8] З улікам адмоваў у рэгістрацыі кандыдатам, вылучаных грамадскім аб'яднаннем «Рух «За Свабоду», які згодна з арт. 60 ВК не мае права вылучаць кандыдатаў у дэпутаты.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Камуністычная партыя Беларусі | 54 | 50 | 7% |
| Ліберальна-дэмакратычная партыя | 107 | 98 | 8% |
| Аб'яднаная грамадзянская партыя | 56 | 47 | 16% |
| Партыя “Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада” | 22 | 14 | 36% |
| Партыя БНФ | 38 | 31 | 18% |
| Рэспубліканская партыя | 6 | 5 | 16% |
| Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці | 43 | 40 | 7% |

Такім чынам, працэнт адмоваў у рэгістрацыі прадстаўнікам, вылучаным апазіцыйнымі партыямі, больш, чым праўладным партыйным вылучэнцам. Так, кандыдатамі ў дэпутаты зарэгістравана 153 вылучэнцы ад апазіцыйных партый з 197 вылучаных, ці 77,7% ад агульнай колькасці вылучаных апазіцыйнымі партыямі (на выбарах 2016 г. – зарэгістравана 85%). У той жа час зарэгістравана 204 вылучэнцы ад праўладных партый з 227 вылучаных, ці 90% ад агульнай колькасці вылучаных праўладнымі партыямі (на выбарах 2016 г. – 86%).

На фоне непразрыстай працэдуры праверкі подпісаў выклікае заклапочанасць вялікая колькасць адмоваў у рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты апазіцыйным актывістам, якія вылучаліся шляхам збору подпісаў.



Аналіз некаторых адмоваў сведчыць аб магчымым злоўжыванні з боку выбарчых камісій пры правядзенні працэдуры праверкі дакументаў, якое магло мець мэтай недапушчэнне вядомых апазіцыйных лідараў да працягу іх удзелу ў выбарчай кампаніі.

Усяго кандыдатамі ў дэпутаты сталі 367 сябраў палітычных партый, ці 65,5% ад агульнай колькасці ўсіх зарэгістраваных, бо некаторыя з іх вылучаліся толькі шляхам збору подпісаў, а не праз з’езды. Больш за ўсё сярод зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты прадстаўнікоў Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі – 98 чалавек, ці 17,5% з агульнай колькасці зарэгістраваных, Камуністычнай партыі Беларусі – 57 (10,2%), Аб’яднанай грамадзянскай партыі – 47 (8,4%).

Кандыдатамі вылучаліся 34 дзеючых дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, а таксама 69 дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў. Амаль усе яны былі зарэгістраваныя: 32 з 34 дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, ці 94% ад агульнай колькасці вылучаных; 66 з 69 дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў (95%). Сярод дзеючых дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў не былі зарэгістраваныя толькі Ганна Канапацкая і Алена Анісім, якія не з’яўляліся праўладнымі.

Доля жанчын сярод зарэгістраваных кандыдатаў складае 27%, што на 2% больш, чым падчас выбараў 2016 г.

## ПЕРАДВЫБАРЧАЯ АГІТАЦЫЯ

### *Умовы агітацыі*

Рашэннямі мясцовых выканкамаў у большасці рэгіёнаў былі створаны спрыяльныя ўмовы для правядзення перадвыбарчай агітацыі: у параўнанні з выбарамі 2016 г. колькасць месцаў для масавых мерапрыемстваў і колькасць памяшканняў для сустрэч кандыдатаў з выбарцамі павялічылася; месцы для размяшчэння агітацыйных матэрыялаў былі зручнымі.

### *Выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу*

Назіральнікамі зафіксаваныя шматлікія факты выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу ў мэтах правядзення праўладнымі кандыдатамі перадвыбарчай агітацыі, і адначасова перашкоды для незалежных і апазіцыйных кандыдатаў.

Так, адміністрацыі навучальных устаноў рыхтавалі сустрэчы з выбарцамі кандыдата ў дэпутаты па Гродзенскай-Занёманскай ВА № 49, галоўнага ўрача дзіцячай паліклінікі Гродна, дэпутата Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў і кіраўніка Гродзенскага гарадскога ГА “Беларускі саюз жанчын” Ірыны Луканскай. 31 кастрычніка кіраўніцтва Гродзенскага прафесійнага хіміка-тэхналагічнага каледжа (старшыня і сябры УВК № 24) сабралі дзеля кандыдата больш за 160 навучэнцаў. 1 лістапада аналагічна была праведзена сустрэча з Ірынай Луканскай у Гродзенскім прафесійным каледжы будаўнікоў, а 6 лістапада – у Гродзенскай гімназіі № 1.

Адзначана, што на апошняй прысутнічалі каля 100 настаўнікаў, сярод якіх сябры УВК № 31, 32, 33.

Праўладны кандыдат у дэпутаты па Смаргонскай ВА № 59, намеснік старшыні Астравецкага райвыканкама Віктар Свіла праводзіў сустрэчы ў смаргонскіх школах № 1 і № 7 у час, калі павінны ісці школьныя заняткі. 6 лістапада Віктар Свіла зладзіў чарговае агітацыйнае мерапрыемства ў аг. Залессе, арганізаванае мясцовым органам улады.

Андрэй Струнеўскі, кандыдат па Салігорскай гарадской ВА № 68, старшыня прафсаюзнай арганізацыі ААТ «Беларуськалій», праводзіў агітацыйныя мерапрыемствы, у тым ліку, і на закрытай тэрыторыі прадпрыемства: у адміністрацыйных памяшканнях, у залах для сходаў у рудніках, абагачальных фабрыках, дапаможных цэхах. Пры тым, што ў графіку яго сустрэч з выбаршчыкамі ўказаны толькі памяшканні ў горадзе. Іншыя кандыдаты такой магчымасці на тэрыторыі прадпрыемства не мелі.

***Перашкоды ў вядзенні агітацыі і цэнзура***

19,4% назіральнікаў у працэсе перадвыбарчай агітацыі адзначылі факты перашкод незалежным і апазіцыйным кандыдатам, якія чыніліся з боку прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і неўстаноўленых асоб. Гэта выражалася ва ўтойванні або прадастаўленні недакладнай інфармацыі пра выбарчае мерапрыемства, адмовах публікаваць перадвыбарчыя праграмы і даваць у эфір трансляцыю выступленняў кандыдатаў у дэпутаты, умяшальніцтве ў масавыя мерапрыемствы кандыдатаў і іх давераных асоб і інш. У параўнанні з мінулымі выбарамі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў колькасць падобных фактаў павялічылася. Афіцыйнай прычынай адмовы публікаваць перадвыбарчую праграму ці трансляваць выступленне кандыдата ў эфіры, як правіла, служылі «прыкметы парушэння арт. 47 Выбарчага Кодэксу Рэспублікі Беларусь».

Прэс-служба БХД паведаміла пра факты ўмяшальніцтва з боку вядучага тэлерадыёкампаніі "Беларусь-3" у запіс афіцыйных тэледэбатаў кандыдатаў па Чкалаўскай ВА № 96 г. Мінска. 30 кастрычніка не выйшаў у эфір на тэлеканале «Беларусь-3» выступ Мікалая Маслоўскага, які балатаваўся ў дэпутаты па Кальварыйскай акрузе № 104. Тэлерадыёкампанія "Гродна" не пусціла ў эфір відэаролік кандыдата ад АГП па Іўеўскай ВА № 54 Ірыны Давідовіч. Тэлеканал «Беларусь-3» зняў з эфіру перадвыбарчы выступ актывіста "Еўрапейскай Беларусі", кандыдата ад партыі БНФ па Светлагорскай ВА № 46 Дзмітрыя Савіча. 5 лістапада адмянілі трансляцыю тэлевыступа кандыдата ад Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці па Полацкай гарадской ВА № 27 Андрэя Мамякова, мясцовае тэлебачанне паказала яе толькі ў некаторых мікрараёнах Полацка.

Таксама грамадзяне краіны не змаглі пачуць выступы або азнаёміцца з перадвыбарчымі праграмамі наступных асоб: Уладзіміра Няпомняшчых, кандыдата ў дэпутаты па Гомельскай-Цэнтральнай ВА № 33 ад АГП – тэлевыступ на "Беларусь-

3”; Аксаны Юшкевіч, кандыдата ў дэпутаты па Чкалаўскай ВА № 96 ад “Еўрапейскай Беларусі” – “Радыё Мінск” і тэлеканал “Беларусь-3”; Міхаіла Бандарэнкі, кандыдата ў дэпутаты па Мазырскай ВА № 42 ад партыі БНФ – «Беларусь-3»; Дзіяны Чарнушынай, кандыдата ў дэпутаты па Мінскай-Каменнагорскай ВА № 101 ад АГП – газета “Звязда”; Мікалая Казлова, кандыдата ў дэпутаты па Старавіленскай ВА № 105, старшыні партыі АГП – тэлеканал “Беларусь-3”.

Перадвыбарчая праграма Аляксандра Комара, кандыдата ў дэпутаты па Бабруйскай-Ленінскай ВА № 78 ад АГП, першапачаткова не была апублікавана газетай «Бабруйскае жыццё» з-за фразы “З Лукашэнкам у краіны няма будучыні”. Пасля абскарджвання адпаведнага рашэння рэдакцыйнага савета газеты ў ЦВК, праграма была апублікавана, але без гэтай фразы.

Адмовы публікаваць перадвыбарчую праграму кандыдатаў сталі распаўсюджанай практыкай. Аналіз пададзеных у газеты перадвыбарчых праграм кандыдатаў у дэпутаты і звестак аб іх публікацыі паказвае, што не былі апублікаваны праграмы 23 кандыдатаў, што складае 1,5% ад агульнай колькасці.

Паводле ЦВК[9], на 11 лістапада толькі 58,9% усіх кандыдатаў у дэпутаты апублікавалі свае перадвыбарчыя праграмы. Найцяжэй ці найменш мэтазгодна публікаваць праграму было ў Мінску. Са 123 зарэгістраваных у мінскіх выбарчых акругах прэтэндэнтаў надрукавалі свае праграмы усяго 53 асобы, што складае 43,1%. Для параўнання: у Мінскай вобласці апублікавалі свае праграмы 72,6% кандыдатаў, у Віцебскай вобласці – 71,8% і г.д.




[9] Даступна тут: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/stat24.pdf.

Такія дадзеныя па друкаваных агітацыйных матэрыялах паказальныя таму, што інтэнсіўнасць заяўленых кандыдатамі ў дэпутаты і іх даверанымі асобамі масавых мерапрыемстваў значна адрозніваецца ў сталіцы і ў рэгіёнах. Паводле дадзеных ЦВК[10], у Мінску на адну каманду кандыдата заяўлена ў сярэднім 135 масавых мерапрыемстваў, у Гродзенскай вобласці – 36 мерапрыемстваў, у Мінскай вобласці – 33, у Гомельскай вобласці – 30, у Магілёўскай вобласці – 14, у Віцебскай вобласці – 13, у Брэсцкай вобласці – 7.

Значна менш эфектыўнай успрымаецца кандыдатамі такая форма агітацыйных мерапрыемстваў, як правядзенне сустрэч кандыдатаў у дэпутаты і іх давераных асоб з выбаршчыкамі і арганізаваныя выбаршчыкамі сходы. На пытанне, ці маглі ўсе кандыдаты на роўных умовах праводзіць сустрэчы з выбаршчыкамі ў вылучаных памяшканнях, 61% назіральнікаў кампаніі адказалі “так”, і адпаведна 29% паведамілі, што ўмовы для кандыдатаў былі няроўныя. Так, кандыдат у дэпутаты па Докшыцкай ВА № 22, дзеючы дэпутат і спікер Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчэнка, акрамя сустрэч з выбаршчыкамі ў спецыяльна вызначаных для гэтага памяшканнях, праводзіў яшчэ і асабістыя прыёмы грамадзян, выкарыстоўваючы памяшканні раённых выканаўчых камітэтаў. Гэтага не маглі зрабіць яго апаненты.

ЦВК паведамляе[11], што кандыдатамі ў дэпутаты былі пададзеныя 980 заяў аб правядзенні 6314 сустрэч с выбаршчыкамі ў памяшканнях, вызначаных мясцовымі выканкамі. Гэта складае ў сярэднім 11 сустрэч на аднаго кандыдата[12]. Падчас выбараў 2016 г. было 8 сустрэч на аднаго кандыдата. У Мінску на адну каманду кандыдата заяўлена ў сярэднім 3 сустрэчы, у Мінскай вобласці – 34, у Гродзенскай і Віцебскай абласцях – па 12 сустрэч, у Брэсцкай вобласці – 9, у Магілёўскай вобласці – 8, у Гомельскай вобласці – 5. Але варта адзначыць, што лічба заяўленых масавых мерапрыемстваў і сустрэч з выбаршчыкамі ў памяшканнях не адлюстроўвае колькасць фактычна праведзеных мерапрыемстваў, таму што кандыдат можа заявіць мерапрыемства, але не праводзіць яго.

На пытанне, ці зафіксаваны факты стварэння перашкодаў пры правядзенні масавых мерапрыемстваў і сустрэч з выбаршчыкамі ў памяшканнях, 19% назіральнікаў кампаніі адказалі станоўча.

10 лістапада падчас агітацыі групу давераных асоб кандыдата па Столінскай ВА № 16 ад БСДП (Грамада) Сяргея Мазана пераследвалі Вадзім Макееў і невядомая асоба ў белым халаце. Яны ўмешваліся, правакавалі кандыдата і яго даверных асоб, вялі відэаздымку. Выклíканыя супрацоўнікі міліцыі не прыдпрынялі мераў у абарону кандыдата. Па словах Сяргея Мазана, у сацыяльных сетках ён атрымлівае пагрозы ад невядомых людзей.

---

[10] Даступна тут: http://www.rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/stat25.pdf.
[11] Даступна тут: http://www.rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/stat26.pdf.
[12] ад першапачатковай колькасці зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты

10 лістапада кандыдат-самавылучэнец па Купалаўскай ВА № 95 Яўген Шэўка паведаміў у фэйсбуку, што з выбарчых стэндаў каля прадпрыемстваў і буйных гандлёвых цэнтраў сталіцы пачалі знікаць яго агітацыйныя плакаты. Такая ж сітуацыя адбываецца з матэрыяламі іншых кандыдатаў па гэтай акрузе. Выключэнне складаюць плакаты дзейснага дэпутата Палаты прадстаўнікоў Таццяны Сайганавай.

***Агітацыя ў СМІ***

У канцы перыяду агітацыі на пытанне, ці з’яўляюцца ў мясцовых дзяржаўных СМІ публікацыі агітацыйнага характару на карысць пэўных кандыдатаў, 30% назіральнікаў кампаніі адказалі станоўча. Пра тое, што ў недзяржаўных СМІ друкуюцца матэрыялы агітацыйнага характару на карысць пэўных кандыдатаў, станоўча адказалі толькі 10% назіральнікаў кампаніі.

Да пачатку агітацыі раённая газета “Калінкавіцкія навіны” перыядычна друкавала “пазітыўныя” матэрыялы пра дзейснага дэпутата Палаты прадстаўнікоў Яўгена Адаменку, які зараз ідзе кандыдатам па Калінкавіцкай ВА № 41. Гэтая практыка працягвалася і падчас агітацыі. Пра актыўнасць іншых трох кандыдатаў па Калінкавіцкай ВА № 41 у газеце не паведамлялася.

10 кастрычніка газета “Маяк” Бярозаўскага раёна апублікавала артыкул пра сустрэчу праўладнага кандыдата па Пружанскай ВА № 9 сп. Аляксандра Леўчука з вучнямі старэйшых класаў і настаўнікамі падчас адзінага дня інфармавання ў СШ № 1 г. Бярозы. Матэрыялаў пра сустрэчы астаніх шасці кандыдатаў па Пружанскай ВА № 9 выданне не дае.

2 лістапада абласная газета “Гомельская праўда” змясціла артыкул з крытыкай выбарчай праграмы кандыдата ў дэпутаты па Гомельскай-Савецкай ВА № 34. Прозвішча кандыдата ў матэрыяле не ўказана, але выбаршчыку робіцца відавочным, што размова ідзе пра актывістку руху “Маці 328” – Таццяну Канеўскую. Нядобрасумленная крытыка адкрытай пазіцыі Таццяны Канеўскай будуецца на спекуляцыі вакол актуальнай праблемы нарказалежнасці і крымінальнага пераследу па адпаведных артыкулах.

***Назіральны савет па СМІ***

Як і падчас папярэдняй выбарчай кампаніі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання быў створаны Назіральны савет па кантролі за выкананнем парадку і правілаў правядзення перадвыбарчай агітацыі ў сродках масавай інфармацыі (Пастанова ЦВК ад 28.08.2019 № 42[13]). Назіральны савет павінны кантраляваць выкананне СМІ заканадаўства пры асвятленні пытанняў падрыхтоўкі і правядзення выбараў і пры неабходнасці ўносіць прапановы на разгляд Цэнтральнай камісіі; забяспечваць роўныя магчымасці для перадвыбарчых выступленняў кандыдатаў у дэпутаты па тэлебачанні, радыё, у друку, пры правядзенні тэледэбатаў; усталяванне СМІ адзіных для ўсіх кандыдатаў памеру і ўмоў аплаты эфірнага часу,

[13] Даступна тут: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/post42.pdf

месца для публікацыі на інфармацыйных рэсурсах у Інтэрнэце, якія набываюцца кандыдатамі за кошт сродкаў уласных выбарчых фондаў. Назіральны савет таксама разглядае спрэчкі, звязаныя з выкарыстаннем СМІ, па зваротах кандыдатаў у дэпутаты і іх давераных асоб, а таксама звароты грамадзян і арганізацый аб парушэннях парадку і правілаў правядзення перадвыбарчай агітацыі.

Прадугледжаная магчымасць прысутнічаць на пасяджэнні Назіральнага савета не толькі членаў ЦВК і работнікаў яе апарату, але і іншых асоб. У сувязі з гэтым варта нагадаць, што падчас папярэдняй выбарчай кампаніі ЦВК адхіліла адпаведную прапанову аб запрашэнні прадстаўніка РПГА “Беларускі Хельсінкскі Камітэт”. Адмова матывавалася тым, што ўдзел іншых асоб не прадугледжаны выбарчым заканадаўствам. Як і на папярэдніх парламенцкіх выбарах, у склад Назіральнага савета быў уключаны старшыня ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» Андрэй Бастунец.

У выбарчы перыяд адбыліся два пасяджэнні Назіральнага савета па кантролю за выкананнем парадку і правілаў правядзення перадвыбарчай агітацыі ў СМІ, на якіх разглядаліся скаргі кандыдатаў у дэпутаты. Ні адна з шасці скаргаў не была задаволена. Абгрунтаванне прынятых рашэнняў не былі апублікаваны, што не спрыяе адкрытасці і галоснасці ў працы дадзенага важнага інстытута.

## ДАТЭРМІНОВАЕ ГАЛАСАВАННЕ

Афіцыйная яўка выбаршчыкаў на датэрміновае галасаванне склала 35,77 %, што з’яўляецца найбольшай для правядзення парламенцкіх выбараў 2008, 2012, 2016 гг.



Назіранне за датэрміновым галасаваннем праводзілася 160 назіральнікамі кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” больш чым на 94 УВК па ўсёй тэрыторыі краіны. На 32 УВК назіральнікі ажыццяўлялі бесперапынны ўлік грамадзян, якія галасавалі датэрмінова. На ўсіх 32 УВК назіралася перавышэнне колькасці прыняўшых удзел у галасаванні, пазначаных у пратаколах УВК, ад дадзеных назіральнікаў. На некаторых УВК розніца ў дадзеных камісій і назіральнікаў па яўцы выбаршчыкаў на датэрміновым галасаванні насіла анамальны характар – у два, тры, пяць і нават у адзінаццаць разоў болей за дадзеныя назіральнікаў.

Так, на УВК № 570 АВК № 107 г. Мінска 16 лістапада згодна з дадзенымі назіральніка, прагаласавала 11 выбаршчыкаў, а паводле пратакола УВК – 121.

На УВК № 390 АВК № 102 г. Мінска 13 лістапада згодна з падлікамі назіральніка, прагаласавала 116 выбаршчыкаў, а па дадзеных пратакола УВК – 238.

На УВК № 295 АВК № 99 г. Мінска 13 лістапада назіральнік налічыў 49 выбаршчыкаў, згодна з пратаколам УВК іх было 199.

На УВК № 570 АВК № 107 г. Мінска 14 лістапада паводле падліку назіральніка, 6 прагаласаваўшых, згодна з пратаколам УВК – 98.

На УВК 295 АВК № 99 г. Мінска 14 лістапада паводле назіральніка, прагаласавала 50 выбаршчыкаў, згодна з пратаколам УВК – 200.

На УВК 390 АВК 102 г. Мінска 14 лістапада па дадзеных назіральніка, 74 выбаршчыкі, згодна з пратаколам УВК – 201.

На выбарчых участках па-за межамі Мінска розніца паміж дадзенымі назіральнікаў і УВК была не настолькі вялікая, але тым не менш яна таксама ёсць.

На УВК № 10 АВК № 46 г. Светлагорск 15 лістапада па дадзеных назіральніка, прагаласавала 58 чалавек, згодна з пратаколам УВК – 105.

На УВК № 19 АВК № 6 г. Баранавічы 16 лістапада па дадзеных назіральніка, прагаласавала 133 чалавек, згодна з пратаколам УВК – 335.

На УВК № 12 АВК № 84 г. Магілёў 15 лістапада па дадзеных назіральніка, 70 выбаршчыкаў, згодна з пратаколам УВК – 271.

***Прымус да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні***

Правядзенне датэрміновага галасавання, як і падчас папярэдніх выбарчых кампаній, насіла арганізаваны характар.

Адміністрацыі дзяржаўных ВНУ, прадпрыемстваў і ўстаноў настойвалі на удзеле грамадзян у датэрміновым галасаванні, вялі ўлік прагаласаваўшых і інфармавалі аб ходзе датэрміновага галасавання мясцовыя выканаўчыя органы ўлады.

Выбаршчыкам даводзілася інфармацыя аб тым, што ўдзел у выбарах носіць абавязковы характар, што выбаршчыкі павінны абавязкова аддаць свой грамадзянскі доўг Радзіме і г.д. Таксама выбаршчыкам паведамлялі пра тое, што ўдзел у выбарах

адсочваецца ці самой адміністрацыяй прадпрыемстваў і ВНУ, альбо прадстаўнікамі іншых дзяржаўных органаў.

У шэрагу выпадкаў назіральнікам кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” сталі даступныя дакументы, якія сведчаць аб тым, што ўдзел выбаршыкаў у датэрміновым галасаванні насіў арганізаваны і кантраляваны характар з боку адміністрацый дзяржаўных прадпрыемстваў і мясцовых выканаўчых органаў улады.

Так, Полацкі раённы выканаўчы камітэт абавязаў кіраўнікоў прадпрыемстваў горада штодня прадстаўляць у аддзел эканомікі Полацкага райвыканкама інфармацыю аб колькасці супрацоўнікаў прадпрыемства, якія датэрмінова прынялі ўдзел у выбарах, за своечасовасць кіраўнікі прадпрыемстваў неслі персанальную адказнасць. Да дакумента за подпісам намесніка старшыні выканкама А.А. Каладынскага прыкладаўся спіс з прадпрыемствамі горада з ўказаннем колькасці працуючых і графікам прадстаўлення інфармацыі.

Таксама на размешчаным на “Радыё Свабода” відэавыступу перад студэнтамі 13 лістапада 2019 г. выкладчыца БДЭУ Аксана Аніскевіч даводзіла да студэнтаў Інстытута сацыяльна-гуманітарнай адукацыі БДЭУ інфармацыю аб абавязковым удзеле паўнагадовых студэнтаў у датэрміновым галасаванні на выбарах дэпататаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Згодна з Аніскевіч, студэнты абавязаныя прыняць удзел менавіта ў датэрміновым галасаванні, у адваротным выпадку будуць “церабіць” заведуючага кафедрай, дэканат і яе асабіста. Таксама выкладчыца ВНУ прыводзіць аргументы аб тым, што “там усё адсочваецца, які пакой прыйшоў, які інтэрнат” і інш. Па дадзеным факце была пададзена заява ў пракуратуру Заводскага раёна г. Мінска аб правядзенні пракурорскай праверкі.

У некаторых выпадках назіральнікі кампаніі сутыкаліся з тым, што выбарчшыкаў прасілі далажыць свайму непасрэднаму начальству аб удзеле ў датэрміновым галасаванні. Так, у інтэрнаце Маладзечанскага завода лёгкіх металаканструкцый віселі адпаведныя абвесткі, а прагаласаваўшых прасілі адзначыцца ў вахцёра. У некаторых выпадках назіральнікі былі сведкамі, калі самі выбаршчыкі прасілі выдаць ім дакумент аб тым, што яны прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні для начальства па месцы іх працы.

Назіральніца са Светлагорска Алена Маслюкова паведамляе, што на ўчастак для галасавання №19 прыйшла жанчына і хацела прагаласаваць. Сказала, што начальнік адправіў, аднак пашпарт з сабой не захапіла. Бюлетэнь ёй не выдалі. Тады жанчына заявіла, што ў яе начальніка заўтра “можа здарыцца інфаркт” і папрасіла выдаць ёй даведку, што яна прыходзіла на ўчастак.

16 лістапада на ўчастку №59 Магілёўскай-Прамысловай выбарчай акругі № 87 выбаршчык, якога адпусцілі з працы, упрошваў сакратара камісіі, якая раней выкладала ў яго ў універсітэце, выдаць яму хоць якую даведку аб тым, што ён прагаласаваў датэрмінова.

На участку № 21 Бабруйскай-Ленінскай акругі № 78 жанчына з “Белпошты” прасіла даведку аб тым, што яна прагаласавала, а потым у якасці доказа сфатаграфавала скрыню для галасавання.

30% назіральнікаў кампаніі, якія назіралі за правядзеннем датэрміновага галасавання на 94-х УВК па тэрыторыі ўсёй краіны адзначалі, што фіксавалі факт прымусу выбаршчыкаў да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні (для параўнання ў 2016 г. – 18%).

У шэрагу выпадкаў арганізацыя ўдзелу выбаршчыкаў у датэрміновым галасаванні насіла характар прымусу: пагрозы нядопуску непрагаласаваўшых студэнтаў у інтэрнаты, непрадстаўлення месцаў у інтэрнаце і інш.

Варта адзначыць, што старшыня ЦВК традыцыйна не бачыць ніякіх праблем у тым, што удзел у датэрміновым галасаванні носіць арганізаваны характар і з’яўляецца непрыхаванай формай выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу органамі дзяржаўнай улады. Паводле Л. Ярмошынай, арганізацыя ўдзелу студэнтаў у галасаванні нішто іншае, як “настойлівае запрашэнне і выхаванне інфантыльнага маладога пакалення”[14].

## ГАЛАСАВАННЕ Ў ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ І ПАДЛІК ГАЛАСОЎ

Згодна з арт. 50 ВК галасаванне праводзіцца з 8 да 20 гадзін. У дзень выбараў перад пачаткам галасавання скрыні для галасавання правяраюцца, пламбуюцца. Бюлетэнь для галасавання выдаецца грамадзяніну сябрам УВК на падставе спісу выбаршчыкаў пасля прад’яўлення пашпарта або іншага дакумента, вызначанага ЦВК.

УВК абавязана забяспечыць магчымасць удзельнічаць у галасаванні выбаршчыкам, якія па стане здароўя або па іншых уважлівых прычынах не змогуць прыйсці ў дзень выбараў ў памяшканне для галасавання. На падставе вусных і пісьмовых просьбаў такіх грамадзян УВК арганізуе галасаванне па месцы знаходжання выбаршчыкаў у дзень выбараў. Афіцыйнага падцвярджэння прычын немагчымасці прыйсці ў памяшканне для галасавання не патрабуецца.

Асноўным прынцыпам правядзення падліку бюлетэняў з’яўляецца іх асобны падлік: спачатку лічаць бюлетэні са скрыняў для датэрміновага галасавання, потым – са скрыняў для галасавання па месцы знаходжання выбаршчыкаў, а потым – са скрыняў для датэрміновага галасавання. Вынікі такога падліку толькі агалошваюцца, а затым шляхам складання вынікаў паасобнага падліку ўсіх відаў галасавання ўстанаўліваюцца на пасяджэнні камісіі і заносяцца ў пратакол аб выніках галасавання. Падлік галасоў пры правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў ажыццяўляецца асобна па кожнай кандыдатуры кандыдата ў дэпутаты.

[14] Даступна тут: https://news.tut.by/economics/661243.html.

Копія пратакола аб выніках галасавання вывешваецца для агульнага азнаямлення. Назіральнік мае права вырабіць сам копію пратакола аб выніках галасавання. Гэта копія сябрамі камісіі не падпісваецца, пячаткай камісіі не зацвярджаецца.

Важна адзначыць, што непасрэдна сам метад падліку бюлетэняў УВК у заканадаўстве не прапісаны, што з’яўляецца адной з асноўных дагэтуль не ўрэгуляваных праблем беларускага выбарчага заканадаўства.

Адзін экзэмпляр пратакола пасля яго падпісання старшынём ці намеснікам старшыні, альбо сакратаром УВК неадкладна прадстаўляецца у адпаведную АВК, другі – у орган, які ўтварыў УВК, для інфармацыі. Трэці экзэмпляр пратакола захоўваецца ў матэрыялах камісіі. Да пратакола, які накіроўваецца ў АВК, дадаюцца, калі яны маюцца, асаблівыя меркаванні сябраў камісіі, заявы давераных асобаў кандыдатаў у дэпутаты і іншых асоб аб парушэннях, дапушчаных у ходзе галасавання ці падліку галасоў, і прынятых па іх рашэннях.

Сама працэдура прыёма АВК пратаколаў і выбарчых бюлетэняў ад УВК законам і пастановамі ЦВК не ўстаноўлена. Вынікі выбараў па выбарчай акрузе зацвярджаюцца на пасяджэнні АВК не пазней чатырох дзён пасля заканчэння галасавання.

Такім чынам, нават з улікам урэгулявання ў пастанове ЦВК права назіральнікаў прысутнічаць пры перадачы пратаколаў аб выніках галасавання і выбарчых бюлетэняў з УВК у АВК назіральнікі застаюцца пазбаўленымі магчымасці назіраць за дадзеным этапам выбараў.

## ГАЛАСАВАННЕ НА ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАХ

Галасаванне на выбарчых участках праводзіцца пад кантролем УВК з улікам правіл і працэдур, прадугледжаных ВК. Станоўчай практыкай з'яўляецца спроба пашырэння магчымасцяў для ўдзелу ў галасаванні людзей з інваліднасцю.

Аб немагчымасці бачыць сталы для выдачы бюлетэняў, кабіны для галасавання і скрыні для бюлетэней паведамілі назіральнікі з 16,1% участкаў, дзе вялося назіранне: з участка №506 АВК № 105 у Мінску, з участка №19 АВК №38 у Віцебску, з участка № 17 АВК № 42 у Мазыры, з участка № 80 АВК № 93 у Мінску, з участка №168 УВК №95 У Мінску ды іншых.

Асноўнай прычынай немагчымасці бачыць сталы для выдачы бюлетэняў, кабін для галасавання і скрыні з’яуляецца тое, што назіральнікаў размясцілі на нязручных месцах, або на вялікай адлегласці ад сталоў для выдачы бюлетэняў.

Толькі 47,4% выбарчых участкаў былі даступныя для людзей з паніжанай мабільнасцю. На 16,7% участкаў, дзе былі грамадзяне з парушэннем зроку, не стварылі магчымасці прагаласаваць пасродкам лупы ці трафарэту.

| Пытанне | ТАК, % | НЕ, % |
|---|---|---|
| Ці прадставілі назіральнікам інфармацыю аб колькасці выбаршчыкаў на ўчастку? | 92 | 8 |
| Ці прадставілі назіральнікам колькасць атрыманых выбаршчыкамі бюлетэняў? | 88,3 | 11,7 |
| Ці прадставілі назіральнікам інфармацыю аб колькасці пажадаўшых галасаваць па месцы свайго знаходжання? | 82,5 | 17,5 |
| Ці маглі назіральнікі бачыць сталы для выдачы бюлетэняў, кабіны для галасавання і скрыні для бюлетэняў? | 83,9 | 16,1 |
| Ці фіксаваліся факты выдачы некалькіх бюлетэняў адной асобе? | 99,3 | 0,7 |
| Ці фіксаваліся выпадкі агітацыі на выбарчым участку? | 97,1 | 2,9 |
| Ці паступалі скаргі на працу камісіі? | 17,5 | 82,5 |
| Ці была прадстаўлена выбаршчыкам з парушэннем зроку магчымасць прагаласаваць пасродкам лупы ці трафарэту? | 83,3 | 16,7 |
| Ці даступны ўчастак для людзей з паніжанай мабільнасцю? | 47,4 | 52,6 |

## ГАЛАСАВАННЕ ПА МЕСЦЫ ЗНАХОДЖАННЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ

Як і падчас мінулых выбараў, фіксаваліся факты арганізацыі галасавання па месцы знаходжання выбаршчыкаў без адпаведных зваротаў выбарцаў. Так, назіральнік ва УВК №63 АВК №25 падчас выезду з сябрамі УВК у вёску Прыдняпроўе Аршанскага раёна высвятліў, што ніхто з 44 выбаршчыкаў з адпаведнага спіса не звяртаўся з заявамі аб галасаванні па месцы свайго знаходжання. Таксама выбаршчыкі абураліся, што ім не прывозілі паведамлення аб маючых адбыцца выбарах, у спіс быў уключаны нават памерлы чалавек.

На УВК №570 АВК № 107 у Мінску большасць выбаршчыкаў, якія былі занесены ў спіс, не падавала заявак аб галасаванні па месцы знаходжання, частка адмовілася галасаваць, частка ўжо прагаласавала на момант наведвання, некаторых не было на

месцы. Нават тыя, хто галасавалі, у большасці адказвалі, што не заяўлялі аб галасаванні па месцы свайго знаходжання. Са спісу ў 40 чалавек пры назіральніку прагаласавала толькі 12. Ва УВК №34 АВК №53 у Гродзенскім раёне назіральніца адзначыла толькі 8 зваротаў па такую форму галасавання, але сябры камісіі, якія ажыццяўлялі выезд для галасавання, атрымалі 208 бюлетэняў.

У 68% выпадкаў назіральнікам дазвалялася паехаць разам з сябрамі камісіі для прысутнасці пры галасаванні па месцы знаходжання. Факты, калі ў спісе выбаршчыкаў для галасавання па месцы іх жыхарства знаходзіліся асобы, якія не звярталіся ва УВК з просьбай аб галасаванні на даму, зафіксаваныя на 60% участкаў, дзе вялося назіранне. У асноўным, УВК традыцыйна ўключалі ў спісы для галасавання па месцы знаходжання без іх просьбаў састарэлых грамадзян, а таксама тых, хто не можа перасоўвацца.

На 5,7% участкаў назірання інфармацыя аб колькасці тых, хто пажадаў прагаласаваць па месцы свайго знаходжання, назіральнікам не прадстаўлялася.

На 25,7% участкаў колькасць тых, хто прагаласаваў па месцы свайго знаходжання, не супала з колькасцю бюлетэняў, скарыстаных сябрамі УВК.

| **Пытанне** | **ТАК, %** | **НЕ, %** |
|---|---|---|
| Ці вёўся асобны спіс выбарцаў, якія заявілі пра сваё жаданне галасаваць па месцы знаходжання? | 100 | 0 |
| Ці зафіксаваны факты ўнясення ў спіс асобаў, якія не звярталіся з падобнай просьбай? | 60 | 40 |
| Ці прадастаўлялася назіральнікам старшынёй УВК інфармацыя аб колькасці тых, хто пажадаў прагаласаваць па месцы свайго знаходжання? | 82,5 | 17,5 |
| Ці выдавалася сябрам УВК, якія ажыцяўляюць арганізацыю галасавання па месцы знаходжання выбарцаў, колькасць бюлетэняў, адпаведная колькасці выбаршчыкаў у спісе? | 74,3 | 25,7 |
| Ці было дазволена назіральнікам паехаць разам з сябрамі камісіі для прысутнасці пры галасаванні па месцы знаходжання выбаршчыкаў? | 82,9 | 17,1 |

| | | |
|---|---|---|
| Ці фіксаваліся выпадкі, калі выбаршчыкі заяўлялі, што не выказвалі жадання галасаваць па месцы свайго знаходжання, калі да іх прыходзілі сябры УВК? | 36,4 | 63,6 |
| Ці фіксаваліся выпадкі прамой ці прыхаванай агітацыі з боку сябраў УВК падчас арганізацыі галасавання па месцы знаходжання выбаршчыкаў? | 2,9 | 97,1 |
| Ці ўносіліся імёны выбарцаў ў спіс для галасавання па месцы знаходжання пасля 18.00? | 0 | 100 |
| Ці захоўваліся скрыні для галасавання па месцы знаходжання выбаршчыкаў у бачным для назіральнікаў месцы? | 91,4 | 8,6 |
| Ці супала колькасць прагаласаваўшых па месцы свайго знаходжання з колькасцю скарыстаных сябрамі УВК бюлетэняў? | 74,3 | 25,7 |

## ПАДЛІК ГАЛАСОЎ

98,7% назіральнікаў сцвярджаюць пра адсутнасць галоснага і празрыстага для ўсіх сябраў камісіі і назіральнікаў падліку галасоў. На парламенцкіх выбарах 2012 г. пра гэта сцвярджалі 92,3% назіральнікаў, а ў 2016 г. – 95,31%.



Такім чынам, падлік галасоў на большасці УВК ажыццяўляўся непразрыста, усімі сябрамі камісіі адначасова, без агучвання выніку галасавання, адлюстраванага ў кожным выбарчым бюлетэні. Назіральнікі (62,9%) адзначалі, што знаходзіліся на такой адлегласці ад стала, дзе вёўся падлік галасоў, якая не дазваляла бачыць змест бюлетэняў.

Супольны і адначасовы падлік бюлетэняў усімі сябрамі камісіі адразу рабіў немагчымым назіранне за працэдурай падліку галасоў. 89,4% назіральнікаў адзначылі, што не маглі бачыць змест бюлютэня.

У 47% выпадкаў не падлічваліся бюлетэні кожнага з кандыдатаў паасобку. У 35% выпадкаў не агучваліся дадзеныя асобнага падліку бюлетэняў.

Непразрыстасць працэдур падліку галасоў не дазваляе зрабіць высновы аб рэальным волевыяўленні выбарцаў і паўтарае негатыўную практыку папярэдніх выбарчых кампаній.

Згодна з п. 15 Палажэння аб парадку накіравання і дзейнасці назіральнікаў пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, зацверджанага пастановай ЦВК ад 06.08.2019 г. №25, назіральнікі, акрэдытаваныя ў АВК, маюць права прысутнічаць пры перадачы пратаколаў аб выніках галасавання і выбарчых бюлетэняў з УВК у АВК. На гэтай падставе сямёра назіральнікаў кампаніі былі накіраваныя ў тыя АВК, дзе яны зарэгістраваныя для ажыццяўлення назірання за дадзеным этапам выбараў.

Адзін з іх не здолеў патрапіць у будынак, у якім знаходзіліся АВК №98 у г. Мінску, і ажыцяўляць назіранне за перадачай пратаколаў з УВК, паколькі супрацоўнікі міліцыі паведамілі яму, што камісія ўжо скончыла сваю працу.

У большасці выпадкаў назіральнікі не былі дапушчаныя да працэдуры праверкі пратаколаў з УВК. Самі пратаколы не агучваліся, назіральнікам не дэманстраваліся, а дадзеныя аб выніках галасавання на выбарчых участках у прысутнасці назіральнікаў у пратакол аб выніках галасавання па выбарчай акрузе не ўносіліся.

## СКАРГІ І ЗВАРОТЫ

Як і на папярэдніх выбарах, суды працягнулі практыку публікацыі судовых пастаноў, прынятых Вярхоўным, Мінскім гарадскім і абласнымі судамі пры разглядзе скаргаў у ходзе выбараў[15].

[15] Даступна на: http://court.gov.by/ru/vibori/suprim/

Згодна са статыстыкай Вярхоўнага Суда, разам па скаргах на рашэнні абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і выканаўчых камітэтаў аб фармірававанні тэрытарыяльных і акруговых выбарчых камісій вынесена 21 рашэнняў. Па дадзеных ЦВК[16], гэтыя рашэнні вынесеныя ў адносінах 171 прэтэндэнта. Усе яны былі пакінутыя без задавальнення. Па тых жа дадзеных, на рашэнні аб фармаванні УВК пададзены скаргі у адносінах да 315 прэтэндэнтаў, тры з якіх лічацца задаволенымі.

Адсутнасць у выбарчым заканадаўстве гарантый уключэння ў склад выбарчых камісій прадстаўнікоў, вылучаных усімі палітычнымі суб’ектамі, якія прымаюць удзел у выбарах, як і раней, робіць практычна немагчымым паспяховае абскарджанне адпаведных рашэнняў.

Астатнія 38 рашэнняў судоў былі вынесеныя ў сувязі з адмовамі ў рэгістрацыі кандыдатаў, вынясеннем папярэджанняў і зняццем кандыдатаў з рэгістрацыі. Вынікі абскарджвання сведчаць, што суды ў цэлым працягваюць практыку падыходу да разгляду выбарчых спрэчак прадузята і павярхоўна, без уліку прэзумпцыі на карысць ажыццяўлення ўдзельнікамі выбараў сваіх правоў і асноўных свабод.

5 лістапада ў Вярхоўным Судзе была разгледжаная скарга Уладзіслава Сысы, на рашэнне ЦВК аб адмове яму ў скарзе на адмену рашэння аб рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты. Рашэнне было прынята ў сувязі з тым, што Уладзіслаў Сыса не пражывае пастаянна ў Рэспубліцы Беларусь, паколькі з’яўляецца студэнтам стацыянарнай формы навучання Варшаўскага ўніверсітэта. Суд пацвердзіў, што Сыса не мог быць зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты. Рашэнне Вярхоўнага Суда відавочна супярэчыць рашэнню Канстытуцыйнага Суда 2001 г. «Аб прававой пазіцыі Канстытуцыйнага Суда адносна выкарыстоўваемага ў артыкуле 80 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь паняцця «грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае ў Рэспубліцы Беларусь».

Названым рашэннем пастаноўлена, што пры вызначэнні месца сталага пражывання трэба ўлічваць не толькі месца фактычнага знаходжання асобы ў той ці іншы перыяд часу (у Рэспубліцы Беларусь альбо за яе межамі), але і яго намер мець дадзенае месца ў якасці месца свайго пастаяннага пражывання. Змест гэтага паняцця прадвызначаецца мэтамі выезду (выбыцця) за межы Рэспублікі Беларусь: ці з'яўляецца выезд часовым або гэта выбыццё на сталае месца жыхарства ў іншую дзяржаву. Выносячы адпаведнае рашэнне, Вярхоўны Суд – вышэйшая інстанцыя судовай сістэмы Рэспублікі Беларусь, прадэманстраваў адсутнасць у сваёй прававой культуры практыкі абгрунтавання абмежавання правоў і асноўных свабод адпаведнымі інтарэсамі, а роўна грэбаванне як міжнароднымі прававымі нормамі, так і нацыянальным заканадаўствам. Дапушчальнае з пункту гледжання інтарэсаў дзяржаўнай бяспекі абмежаванне на ўдзел у выбарах замежных суб'ектаў, а таксама

[16] Даступна на: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/stat6.pdf

абмежаванні на права быць абраным у органы дзяржаўнай улады для грамадзян Беларусі, якія цалкам спынілі маёмасныя і іншыя адносіны з дзяржавай грамадзянскай прыналежнасці, не можа быць адвольна ўжыта ў дачыненні да грамадзян, якія часова адсутнічалі ў Беларусі па характары сваёй дзейнасці або ў сілу іншых абставін.

Паводле афіцыйнай інфармацыі ЦВК, па стане на 16 лістапада ў мясцовыя органы ўлады і выбарчыя камісіі розных узроўняў былі пададзены 938 зваротаў па пытаннях падрыхтоўкі і правядзення выбараў, з іх у 90 зваротах ставіліся пытанні, не звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў, у 64 – "пытанні, звязаныя з тлумачэннем выбарчага заканадаўства", ў 192 – "іншыя пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў".

Са статыстыкі ЦВК магчыма даведацца, якую колькасць з агульнай колькасці зваротаў складаюць скаргі, што падаваліся ў выпадках, прама прадугледжаных ВК: абскарджанне рашэнняў мясцовых выканкамаў аб утварэнні выбарчых камісій, рашэнняў выбарчых камісій аб адмове ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп, кандыдатаў у дэпутаты, вынясенне папярэджанняў ініцыятыўным групам і кандыдатам у дэпутаты і іншае. Але няма абагульненнай статыстыкі па выніках іх разгляду. Тэксты некаторых рашэнняў размешчаны на сайтах мясцовай улады ў рубрыцы "Выбары 2019".

Усяго назіральнікамі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары" падчас выбараў на 17 лістапада пададзены 141 скарга, з іх палова датычылася працэдураў галасавання і падліку галасоў.

## РЭКАМЕНДАЦЫІ

Змены ВК апошніх гадоў не ўлічваюць большасці рэкамендацый АБСЕ і Венецыянскай камісіі, вынесеных па выніках назірання за папярэднімі выбарамі, а таксама прапановы кампаніі «Праваабронцы за свабодныя выбары». Большасць гэтых рэкамендацый не страціла сваю актуальнасць і пасля выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2015 г. Выбары паказалі, што без дэталёвай рэгламентацыі парадку фарміравання ВК, галасавання і падліку галасоў немагчыма забяспечыць правядзенне выбараў, якія б адпавядалі міжнародным стандартам у галіне свабодных і справядлівых выбараў, у прыватнасці, Капенгагенскаму дакументу АБСЕ 1990 г.

Выбарчая кампанія 2019 г. таксама засведчыла неабходнасць забеспячэння рэальнай роўнасці кандыдатаў у сферы доступу да сродкаў масавай інфармацыі і пашырэння правоў назіральнікаў. Змены ў выбарчым заканадаўстве, прапанаваныя ніжэй, дазволяць наблізіць выбары да міжнародных стандартаў, а таксама павялічыць давер да вынікаў выбараў як з боку грамадзян Беларусі, так і з боку міжнароднай супольнасці.

***Выбарчыя камісіі***

У ВК трэба закласці норму, якая б давала гарантыі прысутнасці ў выбарчых камісіях прадстаўнікоў палітычных партый і забяспечвала плюралістычны склад камісій. Неабходна забяспечыць, каб палітычныя партыі, якія прынялі ўдзел у выбарчай кампаніі, у тым ліку парламенцкай, мелі права дэлегаваць аднаго прадстаўніка ў кожную з тэрытарыяльных, акруговых і ўчастковых выбарчых камісій. І толькі ў выпадку, калі палітычная партыя не скарысталася такім правам, мясцовыя распарадчыя і выканаўчыя органы атрымаюць права самастойна запаўняць вакантныя месцы ў выбарчых камісіях. Аналагічным чынам першачарговае права вылучаць сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі павінны мець кандыдаты ў дэпутаты. Акрамя таго, трэба заканадаўча вызначыць крытэрыі для кандыдатаў у склад выбарчых камісій (дэлегаванне палітычнай партыяй, адукацыя, іншыя прафесійныя веды), якія б зменшылі магчымасці адвольнага іх прызначэння і маглі б ацэньвацца судом пры разглядзе адпаведных скаргаў.

***Рэгістрацыя кандыдатаў***

Неабходна выключыць магчымасць выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу пры зборы подпісаў, у прыватнасці, забараніць ажыццяўляць збор подпісаў на тэрыторыях прадпрыемстваў і ўстаноў (у тым ліку адукацыі і аховы здароўя) у мэтах прадухілення магчымасці іх выкарыстання як адміністрацыйнага рэсурсу ў інтарэсах праўладных кандыдатаў. Акрамя таго, трэба прадугледзець права назіральнікаў прысутнічаць пры праверцы подпісаў за вылучэнне кандыдатаў.

***Спісы выбаршчыкаў***

Для павелічэння празрыстасці і падсправаздачнасці працэсу рэгістрацыі выбаршчыкаў неабходна стварыць агульнанацыянальны спіс выбаршчыкаў. Грамадзянам і назіральнікам (у тым ліку davераным асобам, прадстаўнікам СМІ і міжнародным назіральнікам) павінен быць дадзены поўны доступ да спісаў. Кожны грамадзянін павінен мець права знаёміцца са спісамі выбаршчыкаў да пачатку галасавання. Акрамя таго, назіральнікі павінны мець магчымасць знаёміцца з гэтымі спісамі падчас галасавання. Колькасць выбаршчыкаў, зарэгістраваных на ўчастку для галасавання, павінна абвяшчацца выбарчымі камісіямі як напярэдадні галасавання, так і пасля яго заканчэння. Варта стварыць адзіны рэестр усіх выбаршчыкаў Рэспублікі Беларусь.

***Фінансаванне выбараў***

Замацаваная ў ВК норма дазваляе самастойнае выкарыстанне ЦВК сродкаў дзяржаўнага бюджэту на выраб інфармацыйных улетак з агульнымі дадзенымі кандыдатаў замест фінансавання іх выдаткаў на агітацыйныя друкаваныя матэрыялы. Гэта прывяло да нізкай актыўнасці большай часткі кандыдатаў у вырабе агітацыйных матэрыялаў. Таму трэба на заканадаўчым узроўні вярнуць дзяржаўнае фінансаванне

выдаткаў кандыдатаў па вырабу друкаванай агітацыйнай прадукцыі. Варта прадугледзець магчымасць адкрыцця спецыяльных фондаў з моманту рэгістрацыі ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты для аплаты выдаткаў па зборы подпісаў за іх вылучэнне, па аналогіі з прэзідэнцкімі выбарамі.

***Перадвыбарчая агітацыя***

Заканадаўства прадугледжвае працягласць перыяду перадвыбарчай агітацыі не больш за 1 месяц. Такі тэрмін агітацыі абмяжоўвае як кандыдатаў у магчымасці агітацыі, так і грамадзянаў у атрыманні поўнай інфармацыі аб кандыдатах і іх праграмах. Прапаноўваецца павялічыць тэрмін агітацыйнай кампаніі як мінімум да двух месяцаў. Акрамя таго, неабходна пазбавіць суб’ектаў, якія размяшчаюць палітычную рэкламу, адказнасці за змест рэкламы, якую прадаставілі кандыдаты ці палітычныя партыі.

***Судовае абскарджванне рашэнняў, звязаных з выбарамі***

ВК прадугледжвае абмежаваны пералік падстаў для звароту ў судовыя органы. Неабходна прадугледзець магчымасць судовага абскарджання любых рашэнняў выбарчых камісій і іншых дзяржаўных органаў у пытаннях, датычных выбараў. У першую чаргу, неабходна забяспечыць магчымасць судовага абскарджання пастановаў АВК, якімі зацвярджаюцца вынікі выбараў.

***Датэрміновае галасаванне***

Працэдура датэрміновага галасаваня ў яе сённяшнім выглядзе дазваляе ўладам ажыццяўляць розныя маніпуляцыі падчас падліку галасоў. У сувязі з гэтым прапаноўваецца разгледзець магчымасць поўнай адмены датэрміновага галасавання.

У выпадку, калі датэрміновае галасаванне не будзе адменена, прапаноўваецца ўвесці крытэрыі, адпаведнасць якім дае выбарцу права на датэрміновае галасаванне. Такімі крытэрыямі павінны быць падставы, якія адназначна сведчаць аб немагчымасці для выбаршчыка ўзяць удзел у галасаванні ў дзень выбараў, напрыклад, ад’езд за мяжу ці іншыя дакументальна пацверджаныя доказы.

Трэба таксама заканадаўча дэталізаваць працэдуры захавання выбарчых скрыняў, бюлетэняў і спісаў выбаршчыкаў падчас датэрміновага галасавання, апячатвання памяшканняў, дзе знаходзіцца выбарчая скрыня. Неабходна забараніць знаходжанне пабочных асобаў, у тым ліку супрацоўнікаў міліцыі, у памяшканнях для галасавання і пакоях, у якіх захоўваюцца выбарчыя скрыні, бюлетэні і іншыя матэрыялы па выбарах. Таксама неабходна прадугледзець права назіральнікаў знаходзіцца ў памяшканнях для галасавання па-за часам працы выбарчых камісій (перапынак на абед, перыяд пасля заканчэння галасавання) у выпадках, калі там застаюцца сябры выбарчых камісій.

Варта забяспечыць усе УВК празрыстымі цэльнымі выбарчымі скрынямі з пластыкавымі стужкамі для апячатвання (з індывідуальным нумарам выбарчага ўчастка) і арганізаваць відэаназіранне на працягу ўсіх дзён датэрміновага галасавання

ў анлайн-рэжыме. Таксама трэба забяспечыць усе УВК індывідуальнымі пячаткамі з асобнымі нумарамі кожнай УВК, забяспечыць абароненасць выбарчых бюлетэняў адпаведнымі знакамі.

***Галасаванне па месцы знаходжання выбаршчыка***

Трэба вызначыць, што правам на галасаванне па месцы знаходжання карыстаюцца выбаршчыкі са значнымі пашкоджаннямі здароўя (падцверджанымі дакументам медычнай установы), якія перашкаджаюць яму самастойна з'явіцца на ўчастак для галасавання. Трэба замацаваць у ВК, што права на такое галасаванне ўзнікае ў грамадзяніна толькі пасля перадачы ва УВК да дня галасавання пісьмовай заявы аб немагчымасці галасавання на выбарчым участку.

***Падлік галасоў***

Існуючая працэдура падліку галасоў з'яўляецца непразрыстай. Адна з асноўных прычын – адсутнасць дэталізацыі працэдуры падліку галасоў у ВК. У сувязі з гэтым трэба заканадаўча замацаваць наступныя прынцыпы працэдуры падліку галасоў: падлік галасоў праводзіцца галосна ў прысутнасці назіральнікаў, якія могуць сачыць за правільнасцю падліку волевыяўлення выбаршчыкаў у кожным бюлетэні (г.зн. бачыць змест кожнага бюлетэня); падлік галасоў праводзіцца адным з сябраў камісіі, які агучвае і дэманструе ўсім сябрам камісіі і назіральнікам кожны бюлетэнь; падлік галасоў ажыццяўляецца асобна па кожнай скрыні для галасавання, а вынікі такога асобнага падліку галасоў асобна па кожнай скрыні адлюстроўваюцца ў выніковым пратаколе. Копія выніковага пратаколу, завераная старшынёй і сакратаром камісіі і замацаваная пячаткай, выдаецца назіральніку па яго просьбе.

Таксама прапануецца заканадаўча замацаваць права зарэгістраваных у ТВК назіральнікаў і davераных асоб кандытатаў непасрэдна прысутнічаць і назіраць за працэдурамі перадачы выбарчых бюлетэняў і пратаколаў з вынікамі галасавання з участкаў для галасавання ў ТВК. Прадугледзець магчымасць размяшчэння на сайце ЦВК інфармацыі аб выніках галасавання па ўсіх выбарчых акругах з указаннем вынікаў галасавання па кожным выбарчым участку.

***Назіранне за выбарамі***

Для ўзмацнення даверу да выбараў у Беларусі неабходна заканадаўча пашырыць правы назіральнікаў. Назіральнікі павінны мець магчымасць бесперашкодна знаёміцца з матэрыяламі камісіі, якія датычацца яе складу, шляхоў вылучэння ў яе сябраў, спісаў выбаршчыкаў, захавання выбарчых бюлетэняў і скрыняў падчас датэрміновага галасавання, а таксама карыстацца відэа- і фотаабсталяваннем.